НА ШЛЯХУ Ў ПАРЫЖ 9

АБ ГІСТОРЫІ, СЯБРОЎСТВЕ І КАХАННІ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2024 г. СУБОТА № 165 (30299)

КАРАТКА

• **Адукацыя — аснова сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы, заявіла Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля Качанава падчас Мінскага гарадскога адукацыйнага форуму педагагічных работнікаў.**

• Сяўбу азімых збожжавых у Мінскай вобласці правядуць на плошчы каля 400 тыс. га.

• **Парк школьных аўтобусаў Гомельскай вобласці ў 2024 годзе папоўніцца 35 адзінкамі транспарту.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«З гэтага года ў кожнай установе адукацыі штомесяц будзе праходзіць інфармацыйная гадзіна, прысвечаная вывучэнню такой важнай для нас тэмы, як генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адпаведныя навучальныя дапаможнікі распрацаваны сумесна з Генеральнай пракуратурай для ўсіх вучняў з 1-х да 11-х класаў. А дзесяцікласнікі з 1 верасня пачнуць вывучаць новы прадмет «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». гэта не проста перапрацаваны вучэбны дапаможнік. Фактычна гэта светапоглядная, ацэначная работа нашых гісторыкаў на тыя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны са старажытных часоў да сучаснасці».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЕЎРОПЕ ПАТРЭБНЫ НОВЫ ДАГАВОР АБ МІРЫ»

У чым супадаюць пазіцыі Беларусі і Каталіцкай царквы

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Апостальскім нунцыем Антэ Ёзічам, які заканчвае сваю місію ў Беларусі. Рымска-каталіцкая царква ў нашай краіне з'яўляецца другой канфесіяй па колькасці вернікаў. Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Святым прастолам устаноўлены 11 лістапада 1992 года. У Мінску дзейнічае Апостальская нунцыятура. Аляксандр Лукашэнка двойчы наведваў Ватыкан з афіцыйнымі візітамі — у 2009 і 2016 гадах. Антэ Ёзіч прадстаўляў інтарэсы Ватыкана ў Беларусі з 2020 года.

Фота БелТА.

«Мне прыемна з вамі сустрэцца, чалавекам разумным, адукаваным і, самае галоўнае, вельмі дзейным, вельмі актыўным і добразычлівым», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён прызнаўся, што з вялікай цеплынёй успамінае свае сустрэчы з Папам Рымскім: «Мне пашанцавала, кіраўнікі Каталіцкай царквы, з якімі я сустракаўся, былі таксама вельмі сур'ёзнымі і прыстойнымі людзьмі».

«Мне з вамі лёгка размаўляць як з прадстаўніком канфесіі, адной з асноўных у Беларусі, таму што нашы погляды — кіраўніцтва Беларусі і Ватыкана — практычна супадаюць, асабліва па пытаннях бяспекі. Па пытаннях бяспекі ў Еўропе нашы пазіцыі абсалютна сугучныя. І гэта паказвае канфлікт ва Украіне, наконт якога мы займаем літаральна аднолькавую пазіцыю. Я з вамі абсалютна згодны, і мы даўно пра гэта казалі: Еўропе, каб жыць спакойна і жыць так, як мы жывём (як бы мы ні плакаліся, жывём нядрэнна), патрэбен новы дагавор аб міры. Патрэбны новы мір, калі можна так сказаць, у Еўропе. Думаю, што для гэтага актыўнасці Каталіцкай царквы не дастаткова. Трэба яшчэ, каб у еўрапейскіх краінах былі моцныя кіраўнікі, якія зыходзілі б з таго, што трэба бачыць яшчэ інтарэсы і сваіх народаў, а не толькі падпарадкоўвацца камусьці. Трэба бачыць інтарэсы сваіх народаў. На жаль, няхай яны на мяне не пакрыўдзяцца, я такога не бачу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падзякаваў Антэ Ёзічу за дапамогу, якую Каталіцкая царква аказала пры вызваленні 30 беларускіх грамадзян пасля пачатку СВА ва Украіне. «Мы гэта вельмі шануем і будзем памятаць, не забудземся пра гэта», — сказаў ён.

«Я б вас вельмі прасіў, каб вы падрыхтавалі будучага пасланніка ў Беларусь і каб ён быў лепшым, чым папярэдні, у гэтым ёсць сутнасць прагрэсу. Але мы будзем задаволеныя, калі новы пасланнік Папы Рымскага будзе такі, як Ёзіч, мы абсалютна згодны з гэтым. Яшчэ раз паўтараю: мне прыемна з вамі сустрэцца, абмеркаваць тыя пытанні, якія назапасіліся ў адносінах паміж Беларуссю і Ватыканам і Каталіцкай царквой у Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Ёсць пытанне

Узрост магчымасцяў?

Герантолагі раяць пенсіянерам працягваць планаваць будучыню і не адмаўляцца ад прафесійных амбіцый

«Я толькі жыць пачынаю — на пенсію выходжу!»: фраза з савецкага мультфільма ў XXI стагоддзі ўжо не здаецца камічнай. Многія нашы сучаснікі дасягаюць пенсіённага ўзросту, захоўваючы сілы і здароўе. Не трэба ставіць сабе штучных рамак, каб дагадзіць састарэлым стэрэатыпам, сцвярджае кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра актыўнага даўгалецця, галоўны герыятр Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ.

СТАР. 5

Час маладых

І ДОБРЫЯ ЎСПАМІНЫ, І ЗАРОБАК

Чаму студатрадаўскі рух на Гродзеншчыне не збаўляе тэмпы

Чарговы працоўны семестр падыходзіць да завяршэння. І хоць некаторыя студатрады яшчэ будуць запатрабаваны на асенні перыяд, асноўная іх частка завяршыла сваю работу. Згодна з данымі абласнога штаба па каардынацыі і кантролі за работай студэнцкіх атрадаў, у Гродзенскай вобласці сёлета працаўладкавана больш за восем тысяч чалавек. Некаторыя ўдзельнікі студатрадаў падзяліліся ўражаннямі і расказалі, колькі яны зарабілі падчас летняй працы.

СТАР. 7

«ЕЎРОПЕ ПАТРЭБНЫ НОВЫ ДАГАВОР АБ МІРЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Дзякуй за такую высокую ацэнку. Я думаю, што я яе не заслугоўваю, але дзякуй за такія цудоўныя словы ў мой адрас, — адзначыў Антэ Ёзіч. — Вядома, я пасланнік папы ў гэтай краіне, але я працаваў для вашага грамадства, не толькі для каталікоў, але і для ўсіх». Апостальскі нунцый прыехаў у Беларусь у верасні 2020 года, у вельмі няпросты для нашай краіны час. Ён расказаў, як перажываў той перыяд: «Я кожны дзень сачыў за тым, што адбываецца ў краіне. І калі я сустрэўся з Папам Рымскім, першае пытанне было: «Як Лукашэнка?» Я заўважыў, што паміж вамі ёсць добрыя адносіны, якія склаліся на важных добрых прынцыпах».

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

«АМАЛЬ ЧАТЫРЫ ГАДЫ МЫ ПРАЦАВАЛІ ДЗЕЛЯ ГРАМАДСТВА»

Журналістам Антэ Ёзіч расказаў, што галоўнай тэмай яго размовы з Прэзідэнтам сталі пытанні Царквы і ўзаемадзеяння Каталіцкай царквы з дзяржавай. Абмеркавалі і вынікі работы Апостальскага нунцыя за чатыры гады. «Я ўдзячны дзяржаве за тое, што мне далі магчымасць працаваць у гэтай краіне. Амаль чатыры гады мы працавалі не толькі для Каталіцкай царквы, але і на карысць грамадства, беларускага народа. Я рады, што ў мяне была магчымасць тут працаваць, даведацца лепш пра беларускі народ, культуру і разам з дзяржавай вырашаць канкрэтныя пытанні — праблемы Царквы, святароў, вернікаў і іншыя розныя пытанні. Час быў складаны, але гэта стала для мяне вялікім выклікам — прыкласці ўсе намаганні на карысць людзей».

Апостальскі нунцый распавёў, што яго найбольш уразіла ў Беларусі: «Я магу сказаць шмат пазітыўнага пра вашу краіну. І адзін з добрых прыкладаў, які я заўсёды падкрэсліваю, — гэта важныя каштоўнасці, сямейныя каштоўнасці, маральныя каштоўнасці, якіх мы на Захадзе не бачылі. Як народ тут моліцца, як ставіцца да рэлігіі. Тут народ больш адчувае сваю веру, чым на Захадзе, жыве і развіваецца. Ёсць цяжкасці, але вашы людзі заўсёды бачаць самае важнае. Гэта мне вельмі прыемна. Беларусы — добры, міралюбівы народ. Я забіраю з сабой шмат пазітыўнага. Мяне гэта таксама ўзбагаціла».

Падыходы Беларусі і Святога прастола па ключавых пытаннях сусветнага парадку ў многім супадаюць: неабходнасць рэфармавання Хельсінкскага пакта, надзея на адраджэнне прынцыпу шматбаковасці і бесстароннасці ў дзейнасці ААН, каштоўнасць дыялогу як адзінага правільнага шляху вырашэння канфліктных сітуацый... Прадукцыйна развіваюцца кантакты Мінска і Ватыкана ў рамках ААН, дзе прыярытэтнымі пытаннямі ўзаемадзеяння з'яўляюцца сумесныя намаганні па барацьбе з гандлем людзьмі, абарона традыцыйнай сям'і і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ШВЕЙЦАРЫІ ЗАЯВІЛІ АБ РОСЦЕ ТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ПАГРОЗЫ

Кіраўнік Федэральнай разведвальнай службы Швейцарыі (NDB) Крысціян Дзюсі заявіў аб росце тэрарыстычнай пагрозы ў краіне. Аб гэтым паведаміла выданне Tages-Anzeiger. «Узровень тэрарыстычнай пагрозы расце ўжо некалькі гадоў. Але мы канстатуем, што апошнія месяцы гэта праблема стала яшчэ больш востpай», — сказаў Крысціян Дзюсі. Паводле яго слоў, цяпер узровень радыкалізацыі моладзі ў Швейцарыі перавышае сярэднія паказчыкі ў іншых еўрапейскіх краінах, а да ісламісцкіх груповак усё часцей сталі далучацца непаўналетнія. Дзюсі звярнуў увагу на тое, што сёлета толькі за першае паўгоддзе ў Еўропе, уключаючы Швейцарыю, было затрымана каля 30 чалавек па падазрэнні ў падрыхтоўцы тэрактаў, што больш, чым за ўвесь мінулы год, а пераважная колькасць затрыманых — непаўналетнія. У якасці асноўнай прычыны росту радыкалізацыі сярод моладзі кіраўнік NDB назваў актыўную вярбоўку з боку тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава» ў сацыяльных сетках. У рамках гэтай кампаніі баевікі заклікаюць маладых людзей учыняць тэракты па ўсім кантыненце. «Некалькі гадоў таму прыхільнікі ІД ехалі са Швейцарыі ў Сірыю. Цяпер жа джыхадысты знаходзяцца тут», — заўважыў Дзюсі.

ЭКС-ПРЭМ'ЕРУ БАНГЛАДЭШ ПРАД'ЯВІЛІ ЗВЫШ 50 АБВІНАВАЧАННЯЎ

Колькасць абвінавачанняў у розных цяжкіх злачынствах, вылучаных супраць былога прэм'ер-міністра Бангладэш Шэйх Хасіны, пастаянна расце і дасягнула 51. Аб гэтым са спасылкай на газету The Daily Star паведаміла ТАСС. Паліцыя і суды працягваюць устанаўліваць даныя аб гібелі больш як 500 чалавек у антыўрадавых выступленнях, якія праходзілі па ўсёй краіне ў ліпені — жніўні, і вывучаць акалічнасці, што прывялі да такой колькасці ахвяр у выніку дзеянняў сілавікоў па загадзе Шэйх Хасіны і яе міністраў. На аснове пацверджаных звестак былому кіраўніку ўрада прад'яўлены 42 абвінавачанні ў забойстве ўдзельнікаў акцый пратэсту, 7 — у злачынствах супраць чалавечнасці і ў генацыдзе, а таксама ў выкраданні людзей. Акрамя былога прэм'ер-міністра, аналагічныя абвінавачанні прад'яўлены яшчэ 86 асобам, уключаючы генеральнага сакратара партыі «Народная ліга», былога кіраўніка МЗС, экс-міністраў унутраных спраў і юстыцыі. Сярод абвінавачаных таксама — сястра былога кіраўніка ўрада, яе сын і дачка. Усе абвінавачанні плануецца перадаць на судовы разгляд Міжнароднага трыбунала па крымінальных справах.

У БАТСВАНЕ ЗНОЙДЗЕНЫ ВЯЛІЗНЫ ПАЎКІЛАГРАМОВЫ АЛМАЗ



Каштоўны камень знойдзены прыкладна за 500 кіламетраў на поўнач ад сталіцы Батсваны, горада Габароне, на рудніку канадскай кампаніі Lucara Diamond. Яго вага ў неагранёным выглядзе складае 2892 караты (прыкладна 498,4 грама), паведаміла «Бі-бі-сі». З усіх вядомых гісторыкам алмазаў па вазе ён саступае толькі знакамітаму «Кулінану» (620 грамаў), знойдзенаму ў Паўднёвай Афрыцы ў 1905 годзе і разбітаму для агранкі на дзевяць асобных камянёў, многія з якіх упрыгожваюць сімвалы ўлады брытанскіх манархаў і захоўваюцца ў лонданскім Таўэры. Улады краіны ўжо аб'явілі, што гэта самы вялікі алмаз з усіх калі-небудзь знойдзеных у паўднёваафрыканскай дзяржаве.

Міжнародныя стасункі

УЗОР НЕПАРУШНАЙ ДРУЖБЫ І ЎЗАЕМНАГА ДАВЕРУ

Дадзены старт Гадам супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый

Урачыстая цырымонія старту мерапрыемстваў, прысвечаных Гадам супрацоўніцтва Беларусі і Кітайскай Народнай Рэспублікі ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый (2024—2025 гады) прайшла ў Мінску на пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі.

Камень стабільнага развіцця

«На працягу дзесяцігоддзяў нашы краіны з'яўляюцца стратэгічнымі партнёрамі і жалезнымі братамі, дэманструюць сусветнай супольнасці ўзор трывалай, непарушнай дружбы і ўзаемнага даверу, — адзначыў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ.** — У першую чаргу гэта заслуга кіраўнікоў нашых краін. Прынятыя кіраўнікамі дзяржаў сумесныя заявы аб развіцці ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж дзвюма краінамі ў новую эпоху апісваюць прыярытэты і сферы супрацоўніцтва як у двухбаковых адносінах, так і ў рамках рэгіянальных аб'яднанняў, у шматбаковым фармаце. Пастаяннае ўмацаванне палітычнага ўзаемадзеяння, узаемнага даверу і цвёрдая падтрымка адзін аднаго з'яўляюцца краевугольным каменем стабільнага развіцця беларуска-кітайскіх адносін».

Беларусь і Кітай развіваюць супрацоўніцтва ў сферы навукі і інавацый з пачатку 1990-х гадоў. «Сімвалічна, што дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і КНР устаноўлены 20 студзеня 1992 года, а праз літаральна некалькі месяцаў падпісана пагадненне паміж урадамі нашых краін аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, — звярнуў увагу старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях. — Гэты факт сведчыць, што такому супрацоўніцтву першапачаткова была адведзена адна з ключавых роляў ва ўзаемаадносінах паміж Беларуссю і Кітаем. Для абедзвюх краін інавацыйнае развіццё з'яўляецца адным з асноўных прыярытэтаў. У сувязі з гэтым урады нашых краін прынялі рашэнне аб'явіць 2024—2025 гады Гадамі супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый. Упэўнены, што гэтая падзея надасць дадатковы імпульс развіццю двухбаковага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва і ўнясе значны ўклад у рэалізацыю сумесных кааперацыйных праектаў у розных сферах».

«Пашыраць супрацоўніцтва і ствараць новыя платформы»

Напярэдадні ў рамках сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Рамана Галоўчанкі і прэм'-ера Дзяржсавета КНР Лі Цяна зацверджаны план мерапрыемстваў па правядзенні Гадоў супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый. «Дакумент ахоплівае шырокае кола напрамкаў двухбаковага ўзаемадзеяння і прадугледжвае правядзенне сумесных навукова-тэхнічных мерапрыемстваў, стварэнне і развіццё беларуска-кітайскіх платформ супрацоўніцтва, рэалізацыю сумесных навуковых і навукова-тэхнічных праектаў, — заявіў Сяргей Шлычкоў. — Упэўнены, што правядзенне Гадоў супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый выведзе ўзаемаадносіны нашых краін у гэтых сферах на новы ўзровень».

Міністр навукі і тэхналогій Кітая Інь ХЭЦЗЮНЬ адзначыў, што правядзенне Гадоў супрацоўніцтва мае вялікае значэнне для навуковых супольнасцяў Беларусі і КНР. «Хачу павіншаваць усіх з гэтай падзеяй і выказаць глыбокую павагу беларускім калегам, — сказаў ён. — Кітайска-беларуская дружба была і будзе трывалай і даўгавечнай, нашы калегі ў навукова-тэхнічным асяроддзі працягваюць працаваць і рэалізоўваць сумесныя планы. Падпісанне пагадненняў садзейнічае развіццю кантактаў паміж нашымі навукова-тэхнічнымі спецыялістамі і прадпрыемствамі. Трэба выкарыстоўваць гэты шанц, каб прадоўжыць сумесную навукова-тэхнічную і інавацыйную работу, выкарыстоўваць наш патэнцыял, пашыраць супрацоўніцтва ў адукацыі і навучанні таленавітай моладзі, ствараць новыя платформы».

План па правядзенні Гадоў супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый утрымлівае 89 мерапрыемстваў. У выкананні мерапрыемстваў плана будуць задзейнічаны 140 арганізацый (59 — з беларускага боку і 81 — з кітайскага), у тым ліку вядучыя навуковыя цэнтры дзвюх краін, галіновыя ведамствы і іх падведамныя арганізацыі, буйныя тэхналагічныя карпарацыі. Мерапрыемствы плана нацэлены перш за ўсё на развіццё навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, актывізацыю ўзаемнага трансферу тэхналогій і павышэнне эфектыўнасці ўкаранення вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці па асноўных галінах эканомікі.

Напрыклад, у сферы ІКТ планам прадугледжана развіццё супрацоўніцтва Міністэрства сувязі і інфарматызацыі з кітайскімі карпарацыямі Huawei Technologies, ZTE і PhotonSpeak па пытаннях распрацоўкі праграмнага забеспячэння, пашырэння кааперацыі ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, у тым ліку прымянення тэхналогій 5G/6G. З беларускага боку ў гэтай рабоце будуць задзейнічаны Парк высокіх тэхналогій, індустрыяльны парк «Вялікі камень», прадпрыемствы «Белтэлекам» і «Прамсувязь».

Міністэрствам прамысловасці Беларусі сумесна з Цэнтрам міжнароднага эканамічнага і тэхнічнага супрацоўніцтва Міністэрства прамысловасці і інфарматызацыі КНР прадугледжана стварэнне сумеснай платформы рэалізацыі кітайска-беларускага прамысловага супрацоўніцтва. Вынікамі дзейнасці названай платформы будуць пошук партнёраў, трансфер тэхналогій, развіццё супрацоўніцтва з кітайскімі кампаніямі па пастаўках тэхналагічнага абсталявання.

Планам таксама прадугледжана стварэнне ў Мінску праектнага офіса Кітайскага цэнтра трансферу тэхналогій дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, дзейнасць якога курыруецца Міністэрствам навукі і тэхналогій КНР. Работа офіса будзе садзейнічаць як прыцягненню ў Беларусь перадавых замежных тэхналогій, так і камерцыялізацыі вынікаў дзейнасці беларускіх навуковых і інавацыйных арганізацый за мяжой.

Міністэрствам аховы здароўя Беларусі сумесна з Цэнтрам міжнароднага абмену і супрацоўніцтва Дзяржаўнага камітэта аховы здароўя Кітая будзе ажыццяўляцца ўзаемадзеянне па абмене інавацыямі і тэхналогіямі ў галіне медыцыны. Канцэрн «Белнафтахім» сумесна з Цэнтрам даследавання рэсурсаў нафты і газу Кітайскай геалагічнай службы будуць супрацоўнічаць у галіне абмену тэхналогіямі геалагічных даследаванняў, разведкі і распрацоўкі рэсурсаў нафты і газу.

Акрамя таго, з мэтай павышэння эканамічнай эфектыўнасці сумеснай дзейнасці Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях і Міністэрства навукі і тэхналогій КНР правядуць конкурс флагманскіх навукова-тэхнічных праектаў на 2025—2026 гады па кірунках інфармацыйных камунікацыйных тэхналогій, біятэхналогій і медыцыны, машынабудавання, новых матэрыялаў і перадавой вытворчасці. Па выніках гэтага конкурсу плануецца адабраць тры маштабныя сумесныя праекты, вынікамі якіх павінны стаць стварэнне перадавых тэхналогій і арганізацыя сумесных прадпрыемстваў або цэнтраў прамысловых тэхналогій на іх аснове.

Паводле БелТА.

Блізкая ўлада

ЭЛЕКТРАЗАБЕСПЯЧЭННЕ, САДАВОДЧЫЯ ТАВАРЫСТВЫ, ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ...

З чым жыхары шахцёрскага рэгіёна ішлі на прыём да губернатара

Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН правёў асабісты прыём грамадзян у Салігорску. І хоць раён адзін з самых паспяховых, праблем тут усё ж хапае. На прыём да кіраўніка вобласці, які доўжыўся з самай раніцы і да вечара, запісалася больш як 30 чалавек. Карэспандэнт «Звязды» далучыўся да прыёму грамадзян, наведаў горад шахцёраў і разам з адказнымі асобамі пастараўся разабрацца, як трансфармаваць садаводчае таварыства ў населены пункт, чаму пенсіянерка вось ужо 17 гадоў не можа вырашыць пытанне са спадчынай і чаму жанчына, якая выхоўвае дзіця-інваліда, больш за 14 гадоў не можа атрымаць запаветныя метры жылля.

Пра магутнасці і магчымасці

Пажылая маці **жыхаркі Салігорска Іны Аляксандраўны** пражывае ў аграгарадку Ананчыцы і не можа вырашыць пытанне ацяплення і падагрэву вады з дапамогай электрычнасці. На звароты ў абслуговую арганізацыю яна атрымала адмову, матываваную недахопам магутнасцяў сістэмы электразабеспячэння населенага пункта: «Нам адмаўляюць у сувязі з недахопам магутнасцяў электразабеспячэння, кажуць, што ў нас старыя электрасеткі і нічога зрабіць нельга. Маме ўжо 76 гадоў, яна хворая. Як пажылы чалавек можа цягаць дровы і паліць печ? І я ж таксама не магу кожны дзень ездзіць туды...»

Заяўніцы патлумачылі, што ў найбліжэйшы час павелічэння магутнасцяў электразабеспячэння ў населеным пункце не плануецца. **Генеральны дырэктар «Мінскэнерга» Павел Гарудка** пацвердзіў, што сеткі у Ананчыцах старыя, яны знасіліся: «Заяўніца звярталася да нас. Мы выдзелілі на дом чатыры кілаваты з умовай, што тры будуць выкарыстаны на ацяпленне дома. Пазней Іна Аляксандраўна заявіла, што хоча яшчэ 8,5 кілавата. Аднак прапускная магчымасць гэтага не дазваляе. Па дадзенай лініі звярталіся яшчэ два чалавекі, але ім таксама было адмоўлена».

Аляксандр Турчын адзначыў, што для ацяплення невялікага дома чатырох кілават цалкам дастаткова: «Сёння павелічэння да 15 кілават па вёсцы не будзе. У самым лепшым выпадку гэта здарыцца праз 3-4 гады. І, калі вы хочаце зрабіць электраацяпленне і плаціць па льготным тарыфе, гэта трэба рабіць цяпер, пакуль да зімы яшчэ ёсць час. Але варта паглядзець па Ананчыцах: калі населены пункт вялікі, трэба паскоранымі тэмпамі перайсці да яго электрыфікацыі. Тым больш што ў вёсцы, як высветлілася, няма газу».

Дадзенае пытанне перагледзяць з улікам колькасці жыхароў і таго факта, што вёска не газіфікавана і адзіная Альтэрнатыва дровам — электрычнасць. Акрамя гэтага, заяўніцы прапанавалі выкарыстоўваць магчымасць электраацяплення дома ў рамках наяўных тэхнічных магчымасцяў, выкарыстоўваючы канвектары. Губернатар таксама даручыў, каб мясцовыя службы падказалі Іне Аляксандраўне, якія канвектары ўстанавіць у доме, каб хапіла магутнасці трох кілават на ацяпленне.

З садаводчага таварыства — у населены пункт

Зінаіду Іванаўну з Салігорскага раёна таксама хвалюе пытанне электразабеспячэння. У садаводчым таварыстве «Крыніца» вось ужо 30 гадоў дачнікі жывуць без электрычнасці. Будаваць лінію электрапередачы за свой кошт, нават сумеснымі намаганнямі, па словах заяўніцы, не па сілах. Менавіта з гэтай прычыны ўладальнікі дачных домікаў без шкадавання пакідаюць свае ўчасткі. **Старшыня таварыства Сяргей Мікалаевіч** распавёў, што ў адной мясцовасці знаходзіцца адразу чатыры таварыствы, якія не электрыфікаваны. Разам з Зінаідай Іванаўнай яны просяць дапамогі ў вырашэнні пытання.

«Ёсць Указ Прэзідэнта № 155, у якім зацверджана палажэнне аб садаводчых таварыствах. Там выразна прапісана, што засваенне зямельных участкаў агульнага карыстання, уключаючы стварэнне аб'ектаў агульнага карыстання, інжынернай інфраструктуры, ажыццяўляецца за кошт самога таварыства. Заканадаўствам ніякага бюджэтнага фінансавання для стварэння інфраструктуры не прадугледжана. Найбліжэйшая электрастанцыя, да якой можна далучыцца, знаходзіцца за два кіламетры ад таварыства. Кіламетр лініі 10 кілавольт у паветраным выкананні каштуе прыкладна 70—80 тысяч рублёў, два кіламетры — каля 150 тысяч рублёў, плюс установка неабходных элементаў — гэта яшчэ прыкладна 100 тысяч рублёў», — падлічыў генеральны дырэктар «Мінскэнерга» Павел Гарудка.

Па словах кіраўніка цэнтральнага рэгіёна, ёсць два варыянты вырашэння праблемы: «Першы — электрыфікацыя за ўласныя сродкі членаў таварыства. Другі варыянт — трансфармацыя таварыства ў населены пункт. Пры згодзе ўсіх членаў таварыства мы можам стварыць новы населены пункт і пракласці туды адпаведную інфраструктуру. Пры станоўчым вырашэнні пытання гэта будзе ўнікальны выпадак у краіне, які можам выкарыстоўваць і далей. Перагаворыце з людзьмі, са старшынёй сельсавета. Тэма вельмі цікавая. Я лічу, калі людзі гатовыя, неабходна пачынаць і рухацца ў гэтым кірунку».

Таксама Зінаіда Іванаўна пацікавілася, ці можа аўтакрама абслугоўваць іх дачы. Гэтае пытанне было вырашана неадкладна. Праз некалькі дзён аўтакрама будзе прыязджаць у «Крыніцу».

З падобным пытаннем звярнуўся **жыхар Салігорска Ігар Аляксандравіч.** У мужчыны ёсць зямельны ўчастак у садаводчым таварыстве «Іздрашава», размешчанага па суседстве з аднайменнай вёскай. Па словах заяўніка, практычна ўсе члены таварыства выступаюць за тое, каб далучыцца да населенага пункта: «Мы падалі адпаведную заяву, атрымалі адабрэнне выканкама, але электрасеткі не даюць згоду. Маецца шмат дробязяў, з-за якіх таварыства не ўключаюць у межы вёскі. Адна з іх — слупы лініі электраперадач стаяць не на землях агульнага карыстання, а на ўчастках членаў таварыства. Але ж гэтыя слупы ставіліся яшчэ ў 90-я гады, што цяпер каму дакажаш? Ці варта займацца ў далейшым гэтай тэмай?» — задаў пытанне губернатару Ігар Аляксандравіч.

«Тэма досыць цікавая. Дадзенае пытанне неабходна вырашаць комплексна. Трэба ўсім службам, якія прымаюць рашэнне аб уключэнні ці неўключэнні садаводчага таварыства ў межы вёскі, даручыць скласці пералік прадпісанняў, якія трэба выканаць Іздрашаву, каб увайсці ў склад вёскі. Тады людзі будуць разумець, могуць яны ліквідаваць нестыкоўкі ці не. Калі не, вырашым, што рабіць далей», — адзначыў Аляксандр Турчын.

Як адмовіцца ад спадчыны?

Марыя Фёдараўна з Салігорска вось ужо 17 гадоў не можа вырашыць пытанне са спадчынай. Яе дачка даўно жыве за мяжой, пасля смерці бацькі (мужа Марыі Фёдараўны) у спадчыну не ўступала і адмаўляецца ад сваёй долі, пра што неаднаразова дасылала лісты. Пенсіянерка занепакоена тым, што натарыус адмаўляецца афармляць спадчыну: «Мой муж памёр яшчэ ў 2007 годзе. Мая дачка ўжо даўно жыве ў іншай краіне, апошні раз была ў Беларусі ў 2008-м. Яна адмаўляецца ад сваёй долі спадчыны, гэтая кватэра ёй не патрэбна».

Начальнік галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага аблвыканкама Тамара Праскова патлумачыла, што, паводле дзеючага заканадаўства, для таго, каб вырашыць пытанне, неабходна асабістая прысутнасць чалавека, які збіраецца адмовіцца ад спадчыны, альбо яго даверанасць павінна быць аформлена на тэрыторыі Беларусі.

Пры размове з заяўніцай высветлілася, што невядома, якое грамадзянства мае яе дачка, а ад гэтага многае залежыць. Аляксандр Турчын прапанаваў Марыі Фёдараўне стэлефанаваць з дачкой разам з натарыусам. «Спецыяліст задаў бы вашай дачцэ неабходныя пытанні, якія паспрыялі б вырашэнню праблемы. У даверанасці на самай справе пазначаны даныя пашпарта, выдадзенага Салігорскім РАУС у 2003 годзе. Гэта значыць, што ўказаны пашпарт грамадзяніна нашай краіны. Ён можа быць ужо зусім неправадзейны. Неабходна, каб спецыяліст звязаўся з вашай дачкой і задаў прафесійнае, зразумелае і выразнае пытанне. Калі яна сапраўды грамадзянка іншай краіны, тады, думаю, ніякіх праблем не будзе».

Кватэра для сям'і з дзіцем-інвалідам

Салігарчанка Кацярына Сяргееўна вось ужо больш за 10 гадоў не можа атрымаць жыллё. У жанчыны двое дзяцей. Старэйшы сын, якому 14 гадоў, мае групу інваліднасці. З 2010 года сям'я стаіць на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, з 2014-га — на асобнай, льготнай чарзе. Аднак кватэру жанчына так і не атрымала: «Я неаднаразова звярталася ў мясцовы райвыканкам. Мне ўсе кажуць, што чарга яшчэ не падышла. Але ж дамы ў Салігорску будуюцца, у тым ліку для шматдзетных. Дык чаму ж сем'ям, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, у іх не выдзяляюць кватэры?»

Жанчына дадала, што ў 2023 годзе Салігорскі райвыканкам усё ж даслаў запрашэнне на будаўніцтва ў горадзе кватэры. Але потым адклікаў яго: «Я прыйшла ў выканкам, напісала заяву на будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, але, як потым мне патлумачылі, супрацоўнік выканкама дапусціў памылку, і ніякае жыллё нам з дзецьмі не прызначана. Амаль сем месяцаў мяне вадзілі за нос. Казалі, што ў новым мікрараёне Салігорска будзе будавацца шматпавярхоўка для шматдзетных і сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Потым раптам аказалася, што такіх сем'яў не назбіралася, і дом будавацца не будзе. А ў выніку дом гэты ўжо здалі».

Начальнік аддзела па жыллёвых пытаннях упраўлення ЖКГ, энергетыкі і паліва Мінскага аблвыканкама Анастасія Сабірай распавяла, што раней Кацярыне Сяргееўне неаднаразова прапаноўвалася сацыяльнае жыллё, ад якога жанчына адмовілася, бо выказала жаданне будаваць кватэру. «Затым у 2021 годзе, пасля апытання ўсіх шматдзетных сем'яў, салігарчанцы было прапанавана будаўніцтва кватэры з дзяржаўнай падтрымкай. Кацярына Сяргееўна адмовілася ад будаўніцтва, бо захацела будавацца менавіта ў горадзе. Сёння на будаўніцтва ў першую чаргу накіроўваюць шматдзетныя сем'і, у тым ліку шматдзетныя з дзецьмі-інвалідамі і тыя, у каго чацвёра і больш дзяцей. Калі пасля апытання кватэры застаюцца, іх накіроўваюць людзям, якія таксама маюць права на пазачарговае атрыманне жылля».

Старшыня Салігорскага райвыканкама Анатоль Ладыга адзначыў, што ў мікрараёне будуецца 216-кватэрны дом, дзе 160 кватэр выдзелены тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пакуль там ёсць і свабодныя кватэры: «На дадзены момант мы можам прапанаваць Кацярыне Сяргееўне жыллё ў гэтым доме. Але пры ўмове, што не дабавяцца шматдзетныя сем'і. Тыя, хто першапачаткова адмовіўся будавацца ў гэтым доме, могуць перадумаць і зноў пагадзіцца. Тады колькасць свабодных кватэр скароціцца».

«Атрымліваецца, ёсць дом, дзе прадугледжаны кватэры для шматдзетных. Умоўна, нейкай сям'і прапанавалі ў ім будавацца, а яна адмовілася. Але праз тыдзень перадумала і ўжо згодная. Прайшло яшчэ пару дзён — і зноў адмова. Потым зноў згода. І гэта будзе доўжыцца бясконца? — абурыўся губернатар. — У пытанні неабходна паставіць кропку. Трэба выразна сказаць Кацярыне Сяргееўне, ці можа яна разлічваць на будаўніцтва кватэры ў шматпавярхоўцы, якая цяпер будуецца, або пакуль не».

Кіраўнік Міншчыны даручыў прааналізаваць праблему, калі шматдзетныя сем'і могуць адмовіцца ад будаўніцтва жылля, а потым перадумаць, прычым неаднойчы. Калі пытанне актуальна і для іншых рэгіёнаў, вырашаць яго неабходна на заканадаўчым узроўні.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

Аксана КАВАЛЬКОВА:

«ПРАЦАВАЦЬ НА КАРЫСЦЬ ЛЮДЗЕЙ — МАЯ МЭТА, МАЁ ПРЫЗНАЧЭННЕ...»

У словах сенатара шостага склікання, а цяпер — дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, толькі шчырасць. А яе галоўныя жыццёвыя прынцыпы — паважаць людзей і ставіцца да іх так, як яна хацела б, каб ставіліся да яе, не даваць пустых абяцанняў, з максімальнай адказнасцю якасна выконваць пастаўленыя задачы, — ведаюць і блізкія дэпутата, і выбаршчыкі. Яшчэ адно правіла Аксаны Міхайлаўны, якога яна прытрымліваецца, — пастаянна ўдасканальвацца, каб валодаць шырокім спектрам пытанняў, якія могуць узнікнуць у працэсе жыцця і працы.

Каб дапамагаць, трэба шмат ведаць

Яна прывыкла працаваць, сям'я Аксаны Міхайлаўны жыла вельмі сціпла.

— Зарплаты былі невялікія. Каб у дзяцей было ўсё самае неабходнае, бацькі працавалі пасля работы і на выхадных (так званая надомная работа). І мы, дзеці, заўсёды дапамагалі: нарыхтоўвалі лазу, чысцілі і сушылі яе, вышывалі рукавіцы, кручком вязалі сурвэткі і шалі, рабілі мяккія цацкі, — успамінае суразмоўніца.

Пазней, ужо ў школе, будучы сакратаром камсамольскай арганізацыі, Аксана сваім аптымізмам і энергіяй захапляла іншых вучняў. Сумесна арганізоўвалі і праводзілі школьныя кірмашы, а атрыманыя сродкі ішлі на школьныя грамадскія справы. Вялі работу і ў клубе інтэрнацыянальнага сяброўства з дзецьмі з розных краін свету, былі валанцёрамі, членамі Чырвонага Крыжа...

Калі сцены школы для актыўнай, дапытлівай і мэтанакіраванай дзяўчыны сталі цесныя, а да таго ж з'явілася мара лячыць людзей, яна, скончыўшы восем класаў, падала дакументы ў медвучылішча. Пасля яго заканчэння прыступіла да працы медыцынскай сястры. Сваёй чаргой ішло і асабістае жыццё: спачатку замужжа, а затым — дэкрэтны адпачынак. Гэты час маладая жанчына выкарыстоўвала, каб у першую чаргу быць мамай, а яшчэ — каб пераасэнсаваць: ісці ёй далей па медыцынскім шляху і стаць урачом альбо асвоіць іншую спецыяльнасць, патрэбную грамадству і людзям. Выбрала другое і паступіла ў Мазырскі педагагічны інстытут, які таксама паспяхова скончыла. Яшчэ адну адукацыю, эканамічную, Аксана Міхайлаўна атрымлівала, ужо калі падгадавала дзвюх дачок.

Жанчына можа шмат

Перш чым стаць кіраўніком, мая суразмоўніца прайшла ўсе ступені прафесійнага росту: працавала медсястрой у стаматалагічнай паліклініцы, старшай медсястрой, выхавацелем у санаторным дзіцячым садку. А калі ўжо кіравала дашкольнай установай, рызыкнула і прыняла прапанову ўзначаліць вялікую новую школу. Здаецца, усё звычайна і заканамерна. Аднак было адно «але»: школу, дырэктарам якой яна павінна была стаць, патрабавалася яшчэ дабудаваць.

— З будаўнікамі было цяжка, — успамінае Аксана Міхайлаўна. — Яны не ўспрымалі мяне як прадстаўніка заказчыка, працаваў стэрэатып — жанчына не можа разбірацца ў такіх складаных справах, як будаўніцтва. Але прыйшлося і з гэтым спраўляцца. Разбіралася ў чарцяжах, у камунікацыях, матэрыялах, дызайне, каштарысе выдаткаў і шмат у чым яшчэ. Вывучала патрабаванні і тэхналогіі да позняй ночы, бо працягвала працаваць загадчыцай у дзіцячым садку. Вывучыўшы кожны ліст праектнай дакументацыі (а гэта шэсць вялікіх непад'ёмных стопак), загаварыла з падрадчыкамі на адной мове. Так пачалася сумесная работа і ўзаемадзеянне з кіраўнікамі і работнікамі падрадных арганізацый. Да прызначанага часу — пачатку навучальнага года сучасная школа прымала сваіх першых вучняў.

Да таго моманту, калі Аксану Міхайлаўну выбіралі членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, яна ўжо дакладна ведала, што ў першую чаргу ёй трэба — бачыць перспектыву і значную мэту, якая дапаможа дынамічна развівацца нашай краіне. Таму канструктыўна вырашаць пытанні ёй удавалася як з кіраўнікамі рознага ўзроўню, так і з простымі выбаршчыкамі. Яна па-ранейшаму папаўняла свой багаж ведаў, таму што была цвёрда ўпэўнена, што трэба ўдасканальвацца і імкнуцца быць на крок наперадзе, не спыняцца на дасягнутым. Важнымі аспектамі працы дэпутата, на думку Аксаны Міхайлаўны, з'яўляюцца ўсебаковая адукаванасць, адказнасць, мэтанакіраванасць, клопат аб людзях, любоў і адданасць сваёй краіне. Дапамагаюць таксама жыццёвы досвед, веданне псіхалогіі і аналітычныя здольнасці.

— Мне лёгка мець зносіны з выбаршчыкамі, — дзеліцца дэпутат Палаты прадстаўнікоў. — Я не хвалююся, таму што адчуваю і разумею людзей. А калі ў нейкім пытанні некампетэнтная, то ведаю, як і дзе аператыўна знайсці на яго адказ.

Шлях да парламента

Выбранне Аксаны Кавальковай дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь было ў пэўнай ступені прадказальным — можа быць таму, што выбаршчыкі ведалі: сенатар Кавалькова — памочнік людзям. Што яна як дырэктар школы (а цяжар ношы дасведчаныя разумеюць) шмат і цяжка, без выхадных, працавала і добрасумленна выконвала абавязкі сенатара ў трох раёнах Гомельшчыны. У дэпутаты Палаты прадстаўнікоў яе вылучыла беларуская партыя «Белая Русь», але вырашальную ролю ў прыняцці рашэння адыгралі выбаршчыкі. Яны верылі, што будучы дэпутат зробіць шмат добрага для людзей, дзяржавы. Верылі, што яна іх не падвядзе і будзе аддана служыць Радзіме. У выніку за пяць дзён збору подпісаў Аксана Міхайлаўна набрала больш за дзве тысячы галасоў.

Што да рэакцыі на вынікі выбараў, то яе Аксана Міхайлаўна ўспамінае так: «Стрэс і хваляванне. Трэба было кардынальна змяніць сваё звыклае жыццё: пакінуць дом, маці, якой ужо больш за 80 гадоў, родных і блізкіх. Развітацца са школай, надзейным калектывам аднадумцаў і з'ехаць. Усё ў сваёй працы, быце пачаць выбудоўваць нанова. І я пайшла наперад. Інакш было нельга, я не маю права падвесці свой раён, сваіх выбаршчыкаў».

— Чаму Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі? Большую частку сваёй працоўнай дзейнасці вы аддалі педагогіцы...

— Так, падчас работы ў Савеце Рэспублікі я ўваходзіла ў склад камісіі па ахове здароўя, адукацыі, спорце і навуцы. Чаму ў Палаце прадстаўнікоў менавіта гэтая камісія? Правы чалавека — паняцце вельмі шырокае, і дапамога людзям у вырашэнні пытанняў, якія палепшаць іх жыццё, у гэта паняцце таксама ўваходзіць.

Для мяне работа ў камісіі — новы этап у жыцці. З новай мерай адказнасці, якую я адчула адразу, з новымі ведамі і знаёмствамі з паважанымі, кампетэнтнымі калегамі. Вельмі рада, што лёс звёў мяне з вядомымі ў краіне медыйнымі персонамі. Я сама чалавек непублічны, таму работа на камеру мяне хвалявала. Але побач заўжды была і застаецца падтрымка і тыя, з каго можна браць прыклад.

— Раскажыце падрабязней, чым займаецца ваша камісія?

— Пытаннямі правоў чалавека, нацыянальнымі адносінамі і іншымі. У нашай кампетэнцыі — грамадзянства, заканадаўства аб палітычных партыях і іншых грамадскіх арганізацыях, заканадаўства аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, аб сродках масавай інфармацыі.

На пастаяннай аснове працуем з 1 красавіка. Падчас першай сесіі разгледзелі 36 законапраектаў. Хачу падкрэсліць, што дзейнасць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў не абмяжоўваецца пытаннямі вызначанай камісіі. Калі на разгляд паступае новы законапраект, ён знаходзіцца ў свабодным доступе для ўсіх парламентарыяў. І кожны дэпутат вывучае яго, абмяркоўвае са сваімі выбаршчыкамі, слухае іх меркаванні, прапановы. І перш чым законапраект будзе разгледжаны на сесіі Палаты прадстаўнікоў, мы праводзім пасяджэнні рабочых груп, круглыя сталы, падчас якіх дэпутаты, няважна, з якой яны камісіі, маюць права ўносіць свае прапановы або звяртацца ў профільныя камісіі для вырашэння таго ці іншага пытання, якое паступіла ад выбаршчыка.

Як гэта было, напрыклад, з удзельнікамі баявых дзеянняў у Таджыкістане. У нашу камісію звярнуліся ветэраны, выклалі абгрунтаванні і сутнасць прапановы. Я ў сваю чаргу звярнулася ў камісію па працы і сацыяльнай абароне. Было прынята рашэнне сабраць круглы стол з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства абароны, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, камісіі па працы і сацабароне, намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў, дэпутатаў. Мы абмеркавалі прапанову ветэранаў, выпрацавалі алгарытм дзеянняў для яе выражэння.

— Што новага ў заканадаўстве нам чакаць у найбліжэйшы час?

— З чэрвеня гэтага года ўступіў у сілу Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», у якім карэкціруецца парадак стварэння і дзяржаўнай рэгістрацыі рэлігійных арганізацый. Грамадзянам Беларусі з гэтым заканадаўчым дакументам можна азнаёміцца ў свабодным доступе. А калі сцісла, то яго задачамі з'яўляюцца забеспячэнне і гарантаванне правоў кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, на сацыяльную справядлівасць, роўнасць, абарону правоў і законных інтарэсаў незалежна ад стаўлення да рэлігіі і рэлігійнай прыналежнасці, на свабоду аб'яднання ў рэлігійныя арганізацыі пры выкананні прапісаных у законе патрабаванняў. У гэтым законапраекце дакладна ўстаноўлена, што кожнай рэлігійнай арганізацыі неабходна прайсці перарэгістрацыю, а дзяржаўным структурам да 1 студзеня 2025 года забяспечыць унясенне звестак аб рэлігійных арганізацыях у Адзіны дзяржаўны рэгістр. Цяпер на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца 23 законапраекты, якія ўважліва вывучаюцца, абмяркоўваюцца, карэкціруюцца і дадаткова прапрацоўваюцца: «Аб змяненні законаў па пытаннях адукацыі», «Аб ўдасканаленні мер сацыяльнай абароны ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай АЭС», «Аб спажывецкім крэдыце (мікразайме)» і іншыя.

— Парламентарыі працуюць у рэгіёнах. Вы — у сваім родным Мазыры. Якія звароты паступаюць да вас? Ці шмат іх?

— Звароты самыя розныя. Напрыклад, звярнуўся інвалід-калясачнік. Побач з яго домам ёсць крама, але трапіць мужчыну ў яе цяжка. Неабходна было вырашыць пытанне з абсталяваннем безбар'ернага асяроддзя. За гэта і ўзялася адразу. А праз тры тыдні каля магазіна з'явіўся пандус.

У Мазыры ёсць свая чыгуначная станцыя, раней быў рэгулярны рух цягнікоў. Людзі бесперашкодна маглі ездзіць у Мінск, Гомель. Цяпер такой магчымасці няма. Электрацягнік да Мінска і з Мінска курсіруе толькі да станцыі Калінкавічы, а ў сувязі з закрыццём моста ў Мазыры на рэканструкцыю з'явіліся дадатковыя нязручнасці. Цяпер мазыране, а іх 110 тысяч, і госці горада могуць карыстацца толькі маршрутнымі таксі. Дорага і няёмка. Вырашаем пытанне з Міністэрствам транспарту аб вяртанні ранейшага прыпынку для электрацягнікоў і падаўжэнні маршруту да Мазыра.

Звярнуліся да мяне і жыхары мікрараёна па вуліцы Малініна. Скардзіліся на работу кафэ, якое знаходзіцца ў дварах жылых дамоў і дзіцячага садка: шум і неадэкватныя паводзіны наведвальнікаў, нядобразычлівае стаўленне ўладальніка ў адносінах да жыхароў, пастаяннае смецце і гэтак далей. Тут было важна выслухаць абодва бакі. Сумесна з кіраўніцтвам Мазырскага райвыканкама аператыўна сабралі камісію, у якую ўвайшлі намеснік старшыні райвыканкама, прадстаўнікі СЭС, РАУС, падаткоавй інспекцыі, ЖЭУ. Запрасілі гаспадара кафэ і азнаёмілі з усімі скаргамі, праверылі ўсе дакументы на права ажыццяўлення дзейнасці, дагаворы на аказанне паслуг на вываз смецця, энергазабеспячэнне і іншыя. Выехалі на месца і адразу выявілі парушэнне — па часе работы ўстановы. Па астатніх пунктах, кожным асобна, разбіраліся члены камісіі. У выніку складзена прадпісанне ад СЭС, устаноўлены тэрміны ўстаранення парушэнняў, праведзена гутарка з кіраўніком кафэ, дадзены пісьмовыя адказы грамадзянам, якія звярнуліся. Некаторыя акалічнасці, выкладзеныя ў звароце, не знайшлі свайго пацвярджэння. Таму важна заўсёды разбірацца ўважліва і аб'ектыўна, абапіраючыся толькі на ўстаноўленыя факты і дакументы.

Крыніца сіл і натхнення

— Працаваць з людзьмі, іх эмоцыямі, прапускаючы праз сэрца іх беды і праблемы, а потым яшчэ і вырашаць іх, вельмі цяжка. Дзе тая крыніца, з якой вы чэрпаеце сілы?

— Гэта мая родная краіна, мая сям'я. Ганарыся сваімі дзяўчынкамі, дочкамі Кацярынай і Вікторыяй. Яны здзейснілі маю мару — скончылі Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт і працуюць урачамі, дапамагаюць людзям. Калі мяне адольвае стомленасць і пакідаюць сілы, думаю аб сваёй маме, успамінаю тату (яго ўжо з намі няма). Маме за восемдзесят, і ведаю, што ў яе ўсё баліць: рукі, ногі, спіна, мучыць дыхавіца, дрэнна бачыць і чуе. Але ж яна не здаецца і не дазваляе сабе сядзець без справы. Пабыць у агародзе, прыгатаваць паесці, зрабіць прыборку — паспявае ўсё! А мне кажа: «Дачушка, трэба працаваць. Калі я сяду, дык адразу і памру... Рух — гэта жыццё!» Яшчэ адна крыніца — тры ўнучкі. Радасць, якую адчуваю, калі ўдаецца пагутарыць з імі, паклапаціцца пра іх, перадаць словамі немагчыма... Велізарнае задавальненне атрымліваю, калі ўдаецца вырашыць для кагосьці важнае пытанне, дапамагчы людзям. Тады проста вырастаюць крылы, забываеш аб стомленасці і гатовы ісці далей. Гэта таго варта... Трэба паважаць людзей, цаніць кожны дзень мірнага жыцця! Ганарыся тым, што жыву ў цудоўнай краіне — Беларусі. І ўпэўнена, што мы разам пабудуем паспяховую будучыню.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота з архіва Аксаны КАВАЛЬКОВАЙ.

Узрост магчымасцяў?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адно з найважнейшых пытанняў, якое паўстае перад людзьмі, што дасягнулі пенсіённага ўзросту, — ці працягваць працоўную дзейнасць? Людміла Жылевіч адзначае: у 90 % выпадкаў правільны адказ — так. Зразумела, гаворка не ідзе пра людзей, што набылі да пенсіі тыя ці іншыя хранічныя захворванні, якія выключаюць магчымасць работы нават на паўстаўкі. Хвароба не выбірае, але, у рынцыпе, калі чалавек сочыць за сваім здароўем, да пенсіённага ўзросту ён у нашы дні прыходзіць актыўным і захаваным, гаворыць спецыяліст.

— Сёння краіна зацікаўлена ў тым, каб прафесіяналы, якія маюць вялікі вопыт працы, заставаліся ва ўсіх сферах эканомікі. Больш за тое, ёсць тэндэнцыя, каб гэтыя людзі не проста заставаліся на сваіх працоўных месцах, але і станавіліся настаўнікамі для маладых спецыялістаў. Інстытут настаўніцтва — вельмі перспектыўны кірунак: найбагацейшы арсенал назапашанага сталымі прафесіяналамі вопыту неацэнны, асабліва ў такіх галінах, як медыцына, навука, адукацыя, сфера культуры. Людзі, якія дасягнулі пенсіённага ўзросту, маюць патэнцыял, які яшчэ не растрачаны. Але да нядаўняга часу ён заставаўся незапатрабаваным.

ЯК ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ПЕНСІІ

— Людміла Аверкіеўна, існуе паняцце «перадпенсіённая дэпрэсія». Чаму яна ўзнікае? Акрамя таго, вельмі часта дэпрэсія развіваецца ў пенсіянераў...

— Аб тэрмінах прыходу ўласнай пенсіі кожны чалавек, зразумела, ведае загадзя. І ўсё ж, як паказвае практыка, пенсія — суб'ектыўна, зразумела — вельмі часта надыходзіць раптоўна і нечакана. Узнікае разгубленасць: быццам бы я яшчэ гатовы працягваць працоўную дзейнасць, але пенсіённы ўзрост кажа: «Хопіць». Ды і работадавец яшчэ за некалькі гадоў да пенсіі пачынае «скanаваць» цябе на прадмет кваліфікацыі і прафесіяналізму: а ці не сышоў ты з дыстанцыі, ці не выпаў з абоймы? Да таго ж гады за 3-4 да пенсіі чалавек пачынае разумець, што яго магчымасці скарачаюцца: напрыклад, яму няпроста змяніць прадпрыемства або кампанію, бо адным з галоўных крытэрыяў пры прыёме на работу сёння паранейшаму з'яўляецца «ўзроставы цэнз». Усё гэта — выдатная глеба для развіцця так званага «дэпрэсіўнага стану перадпенсіённага ўзросту». Сёння гэтая тэндэнцыя паступова змяняецца, грамадства бярэ курс на тое, каб захаваць прафесійны патэнцыял, назапашаны людзьмі да пенсіі, і я як герыятр не магу гэтаму не радавацца. Ад гэтага выйграе і ў цэлым дзяржава, і пажылыя людзі. Бо на работу часта складана ўладкавацца і моладзі без вопыту. Інстытут настаўніцтва дазваляе, з аднаго боку, захаваць найбагацейшы вопыт сталых прафесіяналаў, з другога — без засцярог узяць маладога спецыяліста, прымацаваўшы да яго дасведчанага настаўніка. У гэтым выпадку хутка вырасціць з маладых кадраў высокапрафесійны калектыў — цалкам дасягальная перспектыва.

— Чаму пенсіянеры хочуць працаваць? Зразумела, што ключавым фактарам тут з'яўляецца матэрыяльны, але ж не толькі?

— Існуюць так званыя запаведзі даўгалецця. І адна з іх — максімальнае падаўжэнне працоўнай дзейнасці, то-бок сацыяльнай, разумовай і фізічнай актыўнасці. Чалавек нярэдка ўспрымае сыход на пенсію як у цэлым «сыход з жыцця». Ён не разумее, што рабіць на пенсіі, ён псіхалагічна да яе не гатовы. Вядома, што з гадамі нам усё складаней «выходзіць са штодзённай руціны», і раптоўнае «выпадзенне» з яе ўспрымаецца часам як катастрофа. У многіх яшчэ перад пенсіяй узнікае страх, што давядзецца перайсці ў іншую прафесійную сферу або на больш нізкую па сацыяльным статусе пасаду — гэта яшчэ адна перадумова для развіцця дэпрэсіі. Хоць варта адзначыць, што вельмі часта па дасягненні пенсіі людзі самі не імкнуцца заставацца на кіруючых пасадах. З аднаго боку, у сталага чалавека ёсць мудрасць, досвед, цярпенне, іншыя якасці, неабходныя кіраўніку. З іншага — яго ўжо гняце тая адказнасць, якая ляжыць на кіруючым складзе, ён хацеў бы працягнуць працаваць у іншым статусе. Напрыклад, загадчык аддзялення пасля выхаду на пенсію пераходзіць у статус проста доктара, і гэта задавальняе і самога пенсіянера, і калектыў.

— Што азначае фраза «падрыхтавацца да пенсіі»? Як гэта зрабіць правільна?

— У жыцці кожнага вельмі важны пяцігадовы перадпенсіённы перыяд. Гэта час, калі трэба падумаць: ці застануся я на гэтай рабоце, ці хопіць у мяне сіл працаваць з такой жа аддачай? Або мне трэба перайсці на больш спакойную пасаду, і гэта дазволіць захаваць баланс паміж маімі патрэбамі і магчымасцямі? Наступнае пытанне — ці дазволіць мне здароўе заставацца ў ранейшай прафесіі? Ёсць шэраг прафесій, якія патрабуюць фізічных намаганняў: будаўнік, работнік фермы, камбайнер, трактарыст і гэтак далей. Можа быць, мне варта атрымаць кваліфікацыю ў сумежнай ці іншай сферы, а можа, проста схадзіць на прыём да кіраўніка і спытаць, дзе яшчэ мае веды і вопыт маглі б быць запатрабаваныя на родным прадпрыемстве. Усё гэта трэба рабіць не за дзень да пенсіі. Калі вы прыйшлі да высновы, што застацца ў прафесіі не атрымаецца, магчыма, варта падумаць аб перакваліфікацыі. Сёння ў нашай краіне развіваецца прафесійнае навучанне менавіта для пажылых людзей. Дзейнічае шэраг праектаў, дзе фарміруюцца «ўзроставыя» групы і працуюць настаўнікі з адпаведнымі ведамі (бо для 18-гадовых і 60-гадовых падача навучальнага матэрыялу патрэбна розная).

Заўважу, што сёння ўжо аксіёма: чым больш на працягу жыцця чалавек набывае навыкаў і ведаў, тым пазней ён старэе. Таму ва ўсім свеце развіваецца сістэма навучання для людзей ва ўзросце 60+. Яшчэ адна агульнасусветная тэндэнцыя — запатрабаванасць працоўнага і прафесійнага рэсурсу пажылых. Такім чынам, у пенсіянераў у нашы дні з'яўляецца цэлы кавалак яркага і паўнацэннага жыцця. Але грамадства павінна быць да гэтага гатовым, у прыватнасці сістэма адукацыі і сістэма працаўладкавання. Прыемна, што паступова Беларусь да гэтага прыходзіць.

МЕЖЫ МЫ ВЫЗНАЧАЕМ САМІ

— Але няўжо пенсія не «заслужаны адпачынак» пасля доўгіх гадоў працы?

— Так, але ў гэтага медаля ёсць адваротны бок. Уявіце: чалавек разганяецца на веласіпедзе, і раптам павінен рэзка спыніцца. Для многіх пенсія — нібы раптоўны ўдар. Высвятляецца, што спяшацца больш няма куды, і пры гэтым незразумела, што з гэтым «не спяшацца» рабіць. Адбываецца парушэнне сацыяльных сувязяў, асабліва калі чалавек шмат працаваў і не фарміраваў той сацыум, які застанецца з ім на пенсіі. Дзеці выраслі і раз'ехаліся, сваякі жывуць далёка, сябры і сяброўкі былі толькі на рабоце. І пенсія абарочваецца сацыяльным вакуумам. Кола замыкаецца чатырма сценамі дома, мозг не атрымлівае новых задач, пачынае фарміравацца ранняя дэменцыя. Такія людзі могуць стаць агрэсіўнымі і раздражняльнымі. Яны пачынаюць раніцу з таго, што прыслухоўваюцца да сябе: дзе ў мяне баліць? Чалавек сыходзіць у хваробы і пакуты. Выйсце — знайсці сабе сферу прымянення. Гэта можа быць прафесійная дзейнасць. Або «сярэбранае валанцёрства» — яшчэ адзін перспектыўны кірунак, які развіваецца ў нашай краіне — або хобі, або атрыманне новых навыкаў. Сёння вельмі актыўна вывучаюцца пытанні даўгалецця: харчаванне ў рэгіёнах, дзе традыцыйна шмат доўгажыхароў, нюансы экалогіі, іншыя фактары. І атрымліваецца, што адзін з галоўных кампанентаў актыўнага даўгалецця — гэта якраз запатрабаванасць чалавека, а таксама наяўнасць у яго жыцці мэт, як кароткачасовых, так і пралангаваных.

— Такім чынам, прафесійная запатрабаванасць — гэта спосаб запаволіць старэнне?

— Так, прычым нават калі пенсіянер працуе на самай простай рабоце. Бо мы вымушаны выконваць рэжым дня, а, устаўшы раніцай, прыводзім сябе ў парадак — не ператвараемся ў тых, каму абы-якавы яго знешні выгляд і рэакцыя навакольных. Наша жыццё не становіцца бясконцым «днём сурка», калі дні не адрозніваюцца адзін ад аднаго. Плюс элемент руху: многія пенсіянеры імкнуцца хадзіць на работу пешшу ў якасці фізічнай актыўнасці. Безумоўна, важны і сацыяльны кампанент. Сацыялізацыя прафілактуе ранняе старэнне: моўная нагрузка, разумовы працэс, камунікацыя — такім чынам падтрымліваецца кагнітыўны статус. Усё гэта — прафілактыка дэпрэсіі і дэменцыі.

Акрамя таго, калі працуеш, кіраўніцтва патрабуе ад цябе выканання дыспансерызацыі. Такім чынам, калі ты сам не хочаш звяртаць увагу на сваё здароўе, будзеш вымушаны гэта зрабіць у парадку працоўнай дысцыпліны: выкарыстоўваць дзень дыспансерызацыі па прызначэнні.

І, нарэшце, працяг працоўнай дзейнасці дапамагае планаваць сваю будучыню і ставіць мэты. У Японіі, краіне доўгажыхароў, напрыклад, у грамадстве прынята працягваць працоўную дзейнасць як мага даўжэй. Гэта лад жыцця, лад мыслення. Чалавек ставіць сабе мэты, каротказтэрміновыя і доўгатэрміновыя, адчувае радасць ад іх дасягнення, глядзіць наперад, а не назад. І мозг настройвае арганізм на хвалю актыўнага даўгалецця.

— Да якога ўзросту вы рэкамендавалі б пенсіянерам працягваць працоўную дзейнасць?

— Рэкамендацый тут быць не можа, усё вельмі індывідуальна. Але пасля 60 гадоў, 70 гадоў — гэта наступны этап, калі чалавеку варта заняцца планаваннем свайго жыцця. Справа ў тым, што да 75 гадоў у многіх пачынаюць напрацоўвацца герыятрычныя сіндромы. Іх можа не быць — і ўсё ж трэба зыходзіць з фізіялогіі арганізма чалавека, які старэе. Зрэшты, сёння вельмі часта да 75 гадоў пажылыя людзі (асабліва жанчыны) цалкам захаваны фізічна і разумова і жывуць паўнавартасна. Так, яны не так хутка бегаюць, як маладыя, не такія шматзадачныя, але, у рынцыпе, на сваім працоўным месцы часам спраўляюцца не горш за маладых. Хачу падкрэсліць: пажылыя кадры «ўсухую» прайграюць маладым толькі ў адным — у веданні ІТ-тэхналогій. І гэта для многіх работадаўцаў вырашальны фактар. Хоць вопытны спецыяліст «за 60» хутчэй знойдзе выхад са складанай прафесійнай сітуацыі, ніколі не падвядзе кіраўніка — як правіла, такія работнікі вельмі адказныя. Таму, паўтаруся, аптымальны варыянт — маладыя спецыялісты плюс вопытныя «аксакалы». Такі тандэм зможа вырашыць любыя задачы. І, дарэчы, сёння вельмі многія пенсіянеры імкнуцца асвойваць ІТ-сферу і лічбавыя тэхналогіі. Гэтыя курсы запатрабаваныя, напрыклад, ва ўніверсітэтах трэцяга ўзросту і ў іншых структурах. Мы, напрыклад, запрашалі навучэнцаў 10—11 класаў, якія вучылі нашых пажылых людзей. І калі моладзь разумее, што галоўнае — пераадолець страх старэйшага пакалення перад гэтай сферай, потым навучанне праходзіць лёгка і эфектыўна.

А ў цэлым хачу падкрэсліць: старэе наша абалонка, а не душа. І ў 70 гадоў чалавек ставіць сабе роўна тыя ж мэты, якія мог паставіць у 40. Тое, што бабуля павінна думаць толькі аб унуках і градках — састарэлы стэрэатып, які грамадства па-ранейшаму навязвае пажылым. Здавалася б, у нас няма эйджызму, і разам з тым грамадская думка не дае пажылым людзям забыцца на ўзрост. «Колькі-колькі вам гадоў? І вы ўсё яшчэ працуеце?!» Сучасныя пенсіянеры маюць вялікі патэнцыял, але сацыяльныя інстытуты і грамадства ў цэлым павінны «падцягнуцца» да гэтай рэальнасці. Трэба мяняць грамадскую думку, трэба, каб работадавец мог прапанаваць сталаму спецыялісту, напрыклад, гнуткі графік або работу анлайн.

— А ці ёсць у працягу працоўнай дзейнасці пасля выхаду на пенсію мінусы?

— Безумоўна, але толькі ў тым выпадку, калі чалавек пераадоленвае свае сілы — напрыклад, працягвае працаваць, каб дапамагаць матэрыяльна дзецям і ўнукам або мае сур'ёзныя праблемы са здароўем. У нас такая праблема: чамусьці бабулі і дзядулі лічаць, што яны павінны выконваць функцыі бацькоў для сваіх унукаў. Бабуля можа спячы пірог, пагладзіць унука па галаве, выслухаць, але яна не павінна аддаваць на рабоце апошнія сілы, каб даваць грошы ўнукам. Пераадоленвание сваіх сіл заўсёды вядзе да паталагічнага старэння, асабліва ва ўзросце 70+. А гэта вельмі хутка прыводзіць да залежнасці ад старонняй дапамогі, і замест таго, каб быць апорай для сваіх дзяцей і ўнукаў, пажылы чалавек становіцца для іх цяжкім клопатам. Дапамагчы дзецям і ўнукам можна не толькі грашыма. Згадзіцеся, выдатна, калі ў доме чысценька, заўсёды гатовыя абед і вячэра. Іншая справа, што людзі, якія побач, павінны цаніць гэта. Бо чаму яшчэ людзі сталага ўзросту імкнуцца застацца на рабоце? Там яна Марыя Іванаўна, шаноўны чалавек, каштоўны спецыяліст, а дома — проста бабуля: падай і прынясі. Уменне шанаваць тое, што робіць для нас нашы пажылыя блізкія, вельмі важна, гэтаму трэба вучыць дзяцей з самага ранняга ўзросту. Бабуля прыгатавала табе абед, нягледзячы на тое, што сёння ў яе высокі ціск, — абдымі яе і скажы «дзякуй».

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Предмет публичных торгов (аукциона)

№	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб.	Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. № 330/С-33528, расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4. Общая площадь: 738,7 кв. м. Наименование: здание банка. Назначение: здание специализированное финансового назначения	783 028,75	488 518,13

Задаток 10 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов (от текущей).
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (тридцать) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.
Переход права собственности – после полной оплаты имущества с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от конечной цены продажи лота в случае, если конечная цена продажи лота составляет до 500 тыс. бел. руб., 0,4 % от конечной цены продажи лота в случае, если конечная цена продажи лота составляет до 500 тыс. бел. руб., в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона): 24.09.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов.
Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 23.09.2024 г. до 17.00**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «ЦветУпак»** (Продавец).

Электронные торги состоятся 30.09.2024.

Лот № 1. Широкоформатная 6-цветная флексографическая машина с зав. № 001254.
Начальная цена с НДС 20 % – 13 080,00 руб. Задаток – 1 308,00 руб.

Лот № 2. Машина для производства цветочной упаковки FRGL с инв. № 0000000021.
Начальная цена с НДС 20 % – 29 280,00 руб.
Задаток – 2 928,00 руб.

Лот № 3. Печатная машина Saturno-1200 с инв. № 24.
Начальная цена с НДС 20 % – 36 600,00 руб. Задаток – 3 660,00 руб.

Лот № 4. Устройство коронной обработки CTE-6000K, 1250 мм, инв. № 28.
Начальная цена с НДС 20 % – 8 640,00 руб. Задаток – 864,00 руб.

Лот № 5. Машина печатная ротографическая Gravure Printing Machine GWASY-600, 8-цветная, комплектная (с комплектом печатных валов), б/у, Китай, с инв. № 3075.
Начальная цена с НДС 20 % – 128 160,00 руб. Задаток – 12 816,00 руб.

Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 25.09.2024 в 16.00.

Организатор электронных торгов:
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

25 сентября 2024 г. **№ 8-Н/2024**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности на земельный участок в г. Гомеле

№ лота	Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель	Целевое назначение/ вид вещного права	Кадастровые номер, площадь земельного участка	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку док-ции, руб.	Наличие ограничений, обременений
1	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-591 (по генплану), ул. Бахчевая, 2	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008003078, 0,0840 га	15 537,68	2 952,16	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
2	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-634 (по генплану), ул. Кирпичная, 15	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002900, 0,0840 га	16 036,41	3 046,92	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
3	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-497 (по генплану), ул. Коралловая, 35	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002781, 0,0810 га	21 169,62	4 022,23	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
4	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-553 (по генплану), ул. Кузнечная, 5	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008004112, 0,0806 га	14 708,15	2 794,55	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
5	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-216 (по генплану), ул. Новаторская, 11	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002543, 0,0780 га	19 322,35	3 671,25	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
6	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-482 (по генплану), ул. Новаторская, 25	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002741, 0,0840 га	20 784,83	3 949,12	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
7	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-188 (по генплану), ул. Полякова И.Е., 12	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002454, 0,0780 га	19 865,85	3 774,51	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
8	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-151 (по генплану), ул. Родная, 24	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002221, 0,0840 га	18 543,86	3 523,33	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ
9	Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-367 (по генплану), ул. Родная, 67	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ частная собственность	340100000008002592, 0,0810 га	17 532,60	3 331,19	Ориентировочно 5 500,00	Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, строительного мусора, следов земляных работ

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. Аукцион состоится 25 сентября 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, **на р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

Перечень документов, представляемых участником:

4.1. заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам Республики Беларусь – копия паспорта, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2. представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок) за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка (в случае предоставления земельного участка в аренду).

7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 26 августа по 23 сентября 2024 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.

Контактный телефон +375 232 30-12-46.

Информация размещена на сайтах:
www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by,
газета «Звязда», «Гомельские ведомости».

І ДОБРЫЯ ЎСПАМІНЫ, І ЗАРОБАК

«ДАЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ЗАНЯЦЦА СПРАВАЙ»

Да летняга працаўладкавання студэнтаў і школьнікаў на Гродзеншчыне падыходзяць сур'ёзна. У абласным камітэце Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі расказалі аб значнай падрыхтоўчай рабоце напярэдадні працоўнага маладзёжнага руху. Зацікаўленых у працы маладых людзей знаёмяць з асноўнымі відамі работ на вызначаных аб'ектах, якіх налічваецца некалькі сотняў. Заключаюць працоўныя кантракты.

Значную ўвагу студатрадаўскаму руху ўдзяляюць мясцовыя ўлады, у прыватнасці, на пасяджэнні абласнога штаба па каардынацыі і кантролі за дзейнасцю студатрадаў. Колькасць іх удзельнікаў значна вырасла за мінулы год і дасягнула васьмі тысяч чалавек. Сёлета было вырашана планку не зніжаць, а нават падняць. Такім чынам, стаяла задача забяспечыць работай 8200 чалавек.

У штабе лічаць, што маладым людзям трэба даць магчымасць заняцца справай і зарабляць грошы сумленнай працай. У сувязі з гэтым у вобласці рэалізоўваецца ўвесь неабходны комплекс мерапрыемстваў. У прыватнасці, усе раёны вобласці вызначыліся з прадпрыемствамі і сельгасарганізацыямі, якія прымуць студэнцкія атрады, а іх было створана 420. Дарэчы, значную колькасць працаўладкаваных сёлета склалі вучні школ. Другое месца па масавасці займаюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, затым ідуць каледжы.

Самым шматлікім сярод ВНУ стаў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы. Студатрады таксама створаны ў Гродзенскіх медыцынскім і аграрным універсітэтах. Дарэчы, медыцынскі і сэрвісны атрады з прадстаўнікамі гродзенскага рэгіёна працуюць у расійскіх аздараўленчых лагерах «Марская хваля» і «Арляня».

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — ЭНТУЗІЯЗМ

Тыя, з кім удалося пагутарыць пасля заканчэння працоўнай змены, ахвотна дзеляцца ўражаннямі, што атрымалі ў працэсе работы. Пры гэтым і заробак належны. Напрыклад, студэнт Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта Мікалай Статкевіч, камандзір студатрада, за месяц зарабіў 1300 рублёў. Пры тым, што праца некваліфікаваная, пераважна — санітарамі.

Медыцынскі атрад «Арытмія» ў складзе 15 чалавек працуе ва ўніверсітэцкай клініцы ў Гродне ў розных аддзяленнях. Сам Мікалай набіраўся вопыту ў хірургіі. Кажа, што праца хоць і нялёгкая, але цікавая.

— Паступова ўцягнуўся ў гэту работу, атрымаў вельмі патрэбны досвед. Заўважыў, што многія нашы студэнты, асабліва першакурснікі, ідуць сюды з вялікім жаданнем, бяруць шмат дзяжурстваў, і пры гэтым ніхто не скардзіцца. Наадварот, ідуць з энтузіязмам, — дзеліцца назіраннямі Мікалай. Іх атрад будзе працаваць да канца жніўня.

Усяго ў медыцынскім ВНУ створана каля двух дзясяткаў атрадаў, большасць з якіх медыцынскія, але ёсць сэрвісныя і будаўнічыя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вось самая вялікая колькасць моладзі задзейнічана ў сферы сельскай гаспадаркі. У іх ліку — сэрвісны атрад «Экіпаж» Гродзенскага раёна, які створаны на базе сельгаспрадпрыемства «Гродзенскі». Камісар атрада, вучань СШ № 27 Гродна Ілья Кабушэўскі расказаў, што сёлета іх атрад у складзе 20 чалавек працаваў на добраўпарадкаванні тэрыторыі сельскай школы, у прыватнасці, займаліся афарбоўкай бетоннай агароджы.

— Мы працавалі, згодна з заканадаўствам, чатыры гадзіны ў дзень, змена заняла 11 дзён. Работа нескладаная, мы яе хутка асвоілі. За гэты перыяд атрымалі каля 400 рублёў. Такія атрады таксама працавалі ў лясгасе на праполцы ў гадавальніку, на гароднінай фабрыцы, у гаспадарках. Мы ўдзельнічалі таксама ва ўсіх маладзёжных мерапрыемствах, а на фестывалі студатрадаў наша візітка заняла першае месца. Яшчэ ў нас была традыцыя віншаваць удзельнікаў атрада з днём нараджэння, мне таксама пашчасціла атрымаць падарунак у сувязі з гэтым, — кажа Ілья.

Аб тым, што жыццё было даволі насычаным, успамінаюць і іншыя студатрадаўцы. У іх ліку — студэнткі ГрДУ імя Я. Купалы Вікторыя Арцукевіч і Святлана Статкевіч. Дзяўчаты — будучыя педагогі, і летні семестр прысвяцілі рабоце ў педагагічных атрадах на базе аздараўленчых летнікаў. Напрыклад, Вікторыя тры змены правяла ў якасці выхавацеля ў дзіцячым летніку «Сузор'е» Гродзенскага раёна. Іх атрад носіць імя Канстанціна Заслонава. Члены атрада працавалі спортінструктарамі, педагогамі-арганізатарамі, важатымі. За змену, якая доўжыцца 15 дзён, можна атрымаць 400—500 рублёў.

— Добра, што студэнты педагагічных спецыяльнасцяў маюць магчымасць сюды прыехаць і набрацца вопыту, некаторыя праходзяць тут практыку, бо такая работа вучыць ладзіць з дзецьмі, — расказвае Вікторыя.

— Летнік — гэта месца не столькі для заробку, колькі для эмоцый, успамінаў, для праяўлення сябе, — падтрымлівае сваю калегу Святлана. — У летнік трэба прыязджаць працаваць, і нават калі адчуваеш выгаранне, дзеці самі прыйдуць на дапамогу і адцягнуць ад сумных думак. Дарэчы, я заўважыла, што яны тут амаль не карыстаюцца тэлефонамі, бо цікава і без гаджэтаў. Гэта было вельмі незвычайна.

Святлана правяла працоўны семестр у летніках «Купалінка» і «Зорка». Кажа, напачатку перажывала, што дзеці не будуць слухаць, бо розніца ва ўзросце не такая вялікая. Але аказалася, што гэтыя хваляванні марныя, бо дзеці, асабліва тыя, хто прыязджае не першы раз, вельмі паважліва ставяцца да работнікаў, ва ўсім дапамагаюць. Ад гэтага, кажа яна, хацелася працаваць яшчэ больш.

Студэнтка лічыць, што лета не прайшло дарма, наадварот, гэты час быў вельмі насычаны эмацыянальна. А галоўнае — яна атрымала вельмі важны вопыт як у наладжванні кантактаў, так і ў фарміраванні характару.

СТУДАТРАДЫ КРУГЛЫ ГОД

ГрДУ імя Янкі Купалы — лідар студатрадаўскага руху сярод ВНУ рэгіёна. А самыя шматлікія тут менавіта педагагічныя атрады, якія налічваюць 470 чалавек. Як правіла, іх удзельнікі працуюць у дзіцячых летніках Гродзенскай вобласці. Звычайна адпрацоўвалі 2-3 змены, але некаторыя нават заставаліся на ўсе пяць.

Як расказала начальнік аддзела падтрымкі маладзёжных праектаў і ініцыятыў ГрДУ імя Я. Купалы Іна Астроўская, апошнім часам гродзенцы сталі выязджаць за межы рэгіёна. Вядзецца супрацоўніцтва з лагерам «Зубраня» Мінскай вобласці. Сёлета ўпершыню выязджалі ў маладзёжны летнік пад Пінскам, што на Брэстчыне.

Таксама ў ГрДУ створаны і працуюць будаўнічыя атрады. Большасць з іх задзейнічаны на аб'ектах Гродна і Астраўца. Днямі два атрады прыступілі да работы на абласной маладзёжнай будоўлі. Такі статус сёлета прысвоены будаўніцтву анкалагічнага дыспансера, а таксама рэканструкцыі корпуса Гродзенскага абласнога цэнтра фтызіятрыі. Студэнты таксама вядуць рамонтныя работы і ў інтэрнатах свайго ўніверсітэта.

Увогуле, геаграфія дзейнасці студатрадаў ГрДУ даволі шырокая. Так, вытворчыя атрады працавалі на прадпрыемствах «МАЗ», «Атлант», гродзенскіх прадпрыемствах «Малочны Свет», «Радыёхваля», кансервавым заводзе. Сёлета 15 чалавек у складзе сэрвіснага атрада працавалі праваднікамі на Беларускай чыгунцы. Напярэдадні яны прайшлі адпаведныя курсы. ВНУ цесна супрацоўнічае з прадпрыемствам «Гроднавідэапракат», куды накіроўваюцца студэнты для работы адміністратарамі, барменамі, афіцыянтамі.

Не першы год універсітэт супрацоўнічае з сельгаспрадпрыемствам «Пагранічны». Як правіла, сюды выязджаюць атрады для збору яблыкаў. Вось і сёлета туды адправяцца студэнты-купалаўцы.

— Новай тэндэнцыяй студатрадаўскага руху можна назваць той факт, што атрады працуюць не толькі летам, а круглы год. Студэнты ў гэтым зацікаўлены, бо ёсць магчымасць прайсці практыку і адначасова атрымаць заробак. Да таго ж работа ў студатрадах станоўча ўплывае на асабісты рэйтынг. Гэта таксама добры стымул для таго, каб стаць іх удзельнікамі, — канстатуе Іна Астроўская.

Акрамя працы, байцы студатрадаў вобласці рэалізоўваюць цэлы шэраг праектаў. У іх ліку — стартавы праект «Выбіраем студатрад». Як расказала другі сакратар абкама БРСМ Наталля Станюкевіч, яго мэта — расказаць кожнаму маладому чалавеку аб магчымасцях працаўладкавання. Тэрытарыяльныя штабы фарміруюць базу даных ахвотных, затым — склад атрадаў.

Напрыклад, у Гродзенскім аграрным універсітэце некалькі гадоў таму пачаў дзейнічаць патрыятычны праект «Зімовы маршрут», да якога далучаюцца іншыя навучальныя ўстановы. Развіваецца таксама праект «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады». Летась імёны знакамітых землякоў, герояў вайны і працы прысвоены 540 атрадам вобласці.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота ўдзельнікаў студатрадаў.

Сяргей НОВІКАЎ:

«МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ СВАЮ ЗАДАЧУ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СПАРТЫЎНАГА РЭЗЕРВУ ВЫКОНВАЕ»

Уся гісторыя беларускага спорту наглядна паказвае, што чэмпіёнам можа стаць кожны. Бо для гэтага ёсць усё. Умовы для трэніровак створаны. Мэтанакіраванасці і працаздольнасці беларусам не займаць. Дасведчаныя трэнеры, здольныя развіць найлепшыя якасці спартсменаў, працуюць не складаючы рук. І ўсё гэта засяроджана не толькі ў сталіцы. Спартыўнае жыццё віруе і ў рэгіёнах. У новай рубрыцы «Малыя адрасы вялікага спорту» мы паспрабуем растлумачыць, чаму ўся Беларусь жыве спортам у прамым сэнсе гэтага слова.

Гістарычна склалася так, што Магілёўская вобласць славілася зімовымі відамі спорту. Мала якая дзіцяча-юнацкая спартыўная школа з раённага цэнтра выхавала некалькіх спарстменаў з алімпійскімі медалямі. Але ў Чавусах выраслі вядомыя біятланісты — алімпійская чэмпіёнка 2018 года Дзінара Алімбекава і сярэбраны прызёр 2010 года Сяргей Новікаў. А ў Бабруйску з розніцай у некалькі гадоў першыя грабкі зрабілі алімпійскія чэмпіёны ў веславанні на каноэ Аляксандр і Андрэй Багдановічы. Тут жа раскрыліся зоркі жаночай барацьбы Ірына Курачкіна і Ванеса Каладзінская, якія заваявалі «серабро» і «бронзу» на Алімпійскіх гульнях у Токіа. Цяжкаатлеты, сярэбраныя прызёры Алімпійскіх гульняў у Рыа Дар'я Навумава і Вадзім Стральцоў, сярэбраны прызёр Афін Андрэй Рыбакоў — таксама магілёўскія спартсмены. Магілёўскую школу цяжкай атлетыкі на Алімпійскіх гульнях у Парыжы прадстаўляла Сюзанна Валадзько, якая заняла чацвёртае месца. Наша сенсацыя — сярэбраны прызёр парыжскіх гульняў Віялета Бардзілоўская — свае першыя скачкі на батуце выканала таксама ў Магілёве. Сярэбраны прызёр гэтай Алімпіяды ў акадэмічным веславанні Яўген Залаты нарадзіўся ў Краснаполлі. Гэта алімпійскія поспехі магілёўскіх спартсменаў у суверэнны перыяд беларускай гісторыі. Ім папярэднічалі перамогі ў спартыўнай гімнастыцы Святланы Баітавай у 1988-м і веславанні на каноэ Аляксандра Масяйкова ў 1992 годзе. Відавочна, спартыўнае жыццё ў Магілёўскай вобласці віруе не толькі зімой, але і круглы год. Пра яго асаблівасці, поспехі і праблемы расказаў начальнік упраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Новікаў.

— Сяргей Валянцінавіч, як развіваецца спартыўная галіна ў рэгіёне?

— Спакойна і размерана. Спорт вярнуўся ў нармальнае рэчышча пасля ковідных часоў. Адхіленне ад міжнародных стартаў, вядома, галаўнога болю дадало, але мы выбудавалі ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі, і спаборніцкай практыкі нашым спартсменам хапае. Асабліва радуе, што многія ўжо дапушчаны да міжнародных спаборніцтваў. Таму глабальных змен у спартыўнай галіне Магілёўскай вобласці няма. Усё ідзе па плане. У звычайным рэжыме дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, вучылішча алімпійскага рэзерву рыхтуюць маладое пакаленне для перадачы ў нацыянальныя каманды. Па выніках 2023 года Магілёўская вобласць перадала самую вялікую колькасць спартсменаў у вышэйшае звяно падрыхтоўкі. Мяркую, гэта вельмі красамоўны паказчык работы школ, цэнтра алімпійскага рэзерву. І мы ідзём толькі на павелічэнне гэтых паказчыкаў. Відавочна, не ўсё так проста, хапае і праблем. Самае балючае пытанне, якое знаходзіцца і ў поле зроку аблвыканкама, Міністэрства спорту і турызму, мабыць, — кадры.

— Праблема старая як свет...

— І вельмі адчувальная, асабліва для раённых цэнтраў. Напрыклад, у Горках выдатная спартыўная інфраструктура, добрая матэрыяльная база, але вынікі слабыя, таму што не хапае спецыялістаў. Мы бачым самы прыдатны варыянт для вырашэння гэтай праблемы — мэтавая падрыхтоўка — у ідэале ў нашым Магілёўскім універсітэце, каб у маладых людзей не было спакусы застацца ў сталіцы ці іншым горадзе. Таму ва ўсіх дзіцяча-юнацкіх школах вобласці вельмі ўважліва сочаць за сваімі выхаванцамі. Аб'ектыўна не ўсе дзеці, што там займаюцца, пяройдуць у вышэйшае звяно. Але яны могуць атрымаць адукацыю трэнера — працоўных месцаў хапае. Напрыклад, у Клімавічах выдатная школа лыжных гонак, адзіны прызёр чэмпіянату свету ў нашай краіне Леанід Карняенка менавіта з Клімавічаў. Лыжныя гонкі там развіваюцца шмат у чым дзякуючы трэнерскай сям'і Шапаравых. Яны выгадавалі не аднаго спартсмена, у іх цэлая плеяда лыжнікаў. Іх каласальны досвед трэба перадаваць моладзі, у ідэале з таго ж рэгіёна. І мэтавая падрыхтоўка ў гэтым пытанні вельмі дапамагае. Умовы для працы створаны, Мінспорту і аблвыканкам маладым спецыялістам усяляк дапамагаюць. А той, хто працуе сумленна, і вынік годны паказвае, і заробак атрымлівае нядрэнны.

— Магілёўская вобласць славіцца традыцыямі ў зімовых відах спорту. Але аб'ектыўна большую цікавасць выклікаюць гульнявыя віды. А тут не ўсё так аптымістычна...

— Не пагаджуся. Каманда Магілёўскага ЦАР па пляжным футболе дастойна выступіла ў Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў. Гэта адна з найлепшых каманд Магілёўскай вобласці ў гульнявых відах спорту. Яны выйгралі чэмпіянат Беларусі і атрымалі права выступіць на Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў у Партугаліі. Сярод 34 каманд-удзельніц заняць шостае месца для абласной каманды — вельмі годны вынік. Пляжны футбол у вобласці развіваецца ўжо даўно, але ў асноўным на ўзроўні ДЮСШ. У Кіраўску ёсць поле для пляжнага футбола, ёсць спецыялісты. Але паколькі аддзяленне ў дзіцяча-юнацкіх школах можа быць толькі па футболе, тры гады таму было прынята рашэнне перадаць каманду ў Магілёўскі цэнтр алімпійскага рэзерву. Вынікі сведчаць, што гэтае рашэнне было правільнае.

— Але адным пляжным футболам жывы не будзеш.

— Не губляецца баскетбольны «Барысфен». У 2023 годзе ўпершыню ў гісторыі заваявалі Кубак Беларусі. У чэмпіянаце краіны два гады запар займалі трэцяе месца, хоць да гэтага пяць гадоў запар былі другімі. Жаночая валейбольная каманда «Камунальнік» заняла трэцяе месца ў чэмпіянаце краіны. Ёсць пытанні да гандбольнага «Магілёва», у гэтым сезоне яны занялі толькі шостае месца ў чэмпіянаце Беларусі. Усё, што вобласць павінна рабіць для клубаў па гульнявых відах спорту, робіць. Каманды часта любяць нараканць на недастатковае фінансаванне. Але Магілёўскую вобласць яны не могуць у гэтым папракнуць. На будучыню ёсць задумка аб'яднаць гэтыя тры клубы па гульнявых відах у адну структуру. Гэта злучана са спецыфікай работы ў арганізацыйным плане, але дасць станоўчы эфект і для спартыўнай часткі. Пры кожным клубе, акрамя дарослай каманды, ёсць і дзіцячая школа. Пры аб'яднанні клубаў школа таксама будзе адна, з трыма кірункамі. Фінансы, спартыўныя аб'екты — усё будзе сумленна дзяліцца паміж імі.

Фота з асабістага архіва героя.

Да нашых клубаў па гульнявых відах спорту цяпер, сапраўды, нямала пытанняў, не заўсёды іх вынік здавальняльны. Але мы не можам не дапамагаць гэтым камандам. Калі ўжо ў вобласці ёсць каманды рэспубліканскага ўзроўню, то трэба накіроўваць на іх крыху больш рэсурсаў. Але і патрабаванні павінны быць больш сур'ёзнымі. Безумоўна, трэба больш увагі звяртаць на спартыўныя школы не толькі пры клубах. Бо аддзяленні па гульнявых відах працуюць у ДЮСШ па ўсёй вобласці, і яны таксама павінны пастаўляць у каманды таленавітых гульцоў. Трэба больш уважліва падыходзіць да адбору маладых, таму што, на маю думку, каманды, якія прадстаўляюць вобласць, павінны складацца са спартсменаў, якія нарадзіліся і выраслі ў гэтай вобласці.

— Магілёўскі спартсмен Ягор Шарамкоў у гэтым сезоне паказвае нядрэнны вынік — выйграваў этап Кубка свету, Гульні БРІКС. Улічваючы нядрэнныя традыцыі спартыўнай гімнастыкі на Магілёўшчыне, як цяпер развіваецца гэты від?

— Так, традыцыі ёсць. Але, на жаль, Магілёўская вобласць таксама адчула негатыўныя наступствы ад'езду спецыялістаў за мяжу. Цяпер трэнераў хапае, але загваздка ў тым, што спартыўная гімнастыка — вельмі спецыфічны від, у якім раскрыцца і трэнеру, і спартсмену вельмі складана. І, на вялікі жаль, вялікага патоку талентаў у нас няма. Тым не менш у частцы падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву рэгіён не прасядае. У школе «Багіма» мы прымаем спаборніцтвы дастаткова высокага ўзроўню, цікавасць ёсць. Але перад усёй спартыўнай гімнастыкай сёння стаіць цэлы комплекс праблем. І гэта датычыцца не толькі Магілёўскай вобласці, але і ўсёй краіны.

— Падобная сітуацыя і з лыжнымі гонкамі: традыцыі ёсць, рэзерв рыхтуецца, а высокіх вынікаў не назіраецца...

— Магілёўская вобласць нязменна займае першае месца ў чэмпіянаце Беларусі па лыжных гонках сярод спартыўных школ. У ДЮСШ вобласці аддзяленні лыжных гонак запоўнены, адкрыты групы ў цэнтры алімпійскага рэзерву. У вобласці ёсць усё неабходнае, прасядання ні ў біятлоне, ні ў лыжных гонках няма. На выніках алімпійскіх дзён моладзі ў лыжных гонках Магілёўская вобласць заняла першае месца. Перадача спартсменаў у асноўную каманду праходзіць без праблем кожны год. Напрыклад, Раман Ялетнаў, які займаўся біятлонам, і перайшоў у лыжныя гонкі, наш выхаванец. Вобласць сваю задачу выконвае. Чаму няма плёну, варта спытаць у вышэйшага звяна.

— Знакамітая біятлонная школа ў Чавусах аднымі дасягненнямі Сяргея Новікава і Дзінары Алімбекавай жыць не будзе. Якія перспектывы вы бачыце ў выхаванцаў гэтай школы?

— У Чавусах выраслі не толькі Новікаў і Алімбекава. Раман Ялётнаў таксама адтуль. Павел Бялько, член нацыянальнай каманды па біятлоне, родам з Чэрыкава, але спартыўны шлях пачынаў у Чавусах. І цяпер там ёсць перспектыўныя дзеці. Але казаць аб тым, што ўсе з іх абавязкова стануць алімпійскімі чэмпіёнамі, няправільна. Ад Чавус да Алімпійскіх гульняў ім трэба прайсці вялікі шлях, і невядома, як ён складзецца. У Чавусах дзеці трэніруюцца да 11 класа школы, а як складзецца іх дарослае жыццё і як яны сябе ў ім рэалізуюць, ніхто не ведае.

— Назіраецца наступная сітуацыя: вобласць рыхтуе рэзерв, праводзіць селекцыю, песціць сваіх маладых спартсменаў. Найлепшыя трапляюць у нацыянальныя каманды. Але на шляху да нацкаманды большасць з іх губляецца, а медалі заваёўваюць і зусім адзінкі. На вашу думку, чаму так?

— Усё вельмі празаічна: пачынаюцца праблемы са здароўем, многім надакучае пастаянна трэніравацца, маладыя людзі знаходзяць сябе ў іншай сферы, губляецца матывацыя — прычын маса. Не можа кожны выхаванец ДЮСШ ці вучылішча алімпійскага рэзерву стаць чэмпіёнам свету. Немалаважна, што маладыя чалавек, які прайшоў праз гэтыя ўстановы, фізічна развіты, здаровы, захоплены спортам. На гэта таксама не варта забывацца.

— Але ж дзяржава ўкладвае грошы ў падрыхтоўку рэзерву, які ў перспектыве будзе прыносіць краіне медалі...

— У ідэале, вядома, кожны выпускнік дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ павінен стаць чэмпіёнам свету або, яшчэ лепш, алімпійскім чэмпіёнам. Але ў жыцці так не бывае. Выхаванне спартсмена ад ДЮСШ да Алімпіяды — гэта найцяжэйшы працэс, у якім варта ўлічваць масу нюансаў, а мноства з іх і зусім немагчыма прадбачыць. Можа, спецыялістам з вышэйшага звяна, трэнерам, якія працуюць з нацыянальнымі камандамі, трэба больш увагі звяртаць на рэгіёны. Мы заўсёды за тое, каб ладзіць у нас майстар-класы, семінары, сустрэчы. Для гэтага ўсё ёсць.

— Сяргей Валянцінавіч, развіццё якіх відаў спорту ў Магілёўскай вобласці цяпер набірае абароты?

— Пасля чацвёртага месца на Алімпійскіх гульнях у Токіа нашай спартсменкі Карыны Дзямінскай стральба з лука набыла «другое дыханне». Спаборніцтвы па гэтым відзе, нагадаю, праходзілі ў Магілёве ў рамках II Гульняў краін СНД у мінулым годзе, нашы спартсмены таксама выступілі годна. Пасля Гульняў краін СНД інвентар застаўся ў нас, што, вядома, дапамагае ў развіцці. Від спорту спецыфічны, але веру, што перспектыўны. Плаванне набірае абароты. Хацелася б больш актыўнага развіцця для тэніса, корты ёсць, аддзяленне ёсць, але катастрафічна не хапае трэнераў.

— Якія новыя спартыўныя аб'екты з'явяцца ў Магілёўскай вобласці?

— Спартыўная грамадскасць доўга скардзілася, што ў Магілёве не хапае лёду для заняткаў фігурным катаннем і канькабежным спортам. Лядовая арэна, якой 22 гады, запоўненая на 98,9 працэнта. З-за гэтага шорттрэкісты, канькабежцы вымушаны з Магілёва ездзіць у Шклоў на трэніроўкі. Таму цяпер вядзецца праектаванне хакейнай арэны, якая таксама будзе мець канькабежную дарожку. Такога аб'екта сапраўды вельмі не хапае. Распрацоўваюцца праекты будаўніцтва новых басейнаў. Плануецца рэканструкцыя коннага цэнтра. У распрацоўцы знаходзіцца праект сучаснай вяслярнай базы ў Бабруйску. Тут выраслі два алімпійскія чэмпіёны па веславанні, традыцыі каласальныя, але да гэтага часу спартсмены пераапранаюцца на беразе ракі ў хатках 1960-х гадоў пабудовы, дзе нават душа няма. Гэта неабходна выпраўляць. Шэраг спартыўных аб'ектаў перажываюць рамонт. Акрамя таго, у рамках праекта «Спорт для ўсіх» Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў многіх гарадах адкрыты шматфункцыянальныя пляцоўкі, даступныя ўсім ахвотным.

— Сяргей Валянцінавіч, з пункту гледжання не функцыянера, а спартсмена, што вы можаце параіць спартсменам, якія ўсё яшчэ адхілены ад міжнародных стартаў?

— Алімпійскія гульні ў Парыжы паказалі, што калі падчас адхілення ўпарта працаваць і не апускаць рукі, то па вяртанні можна гучна аб сабе заявіць. Так, прадстаўнікі многіх відаў, напрыклад, лёгкай атлетыкі, да гэтага часу ў «бане». І відавочна, што іх гэта не задавальняе. Але ёсць спаборніцтвы з расійскімі спартсменамі, ёсць матэрыяльная падтрымка ад федэрацый па відах спорту, міністэрствы, абласныя стыпендыі. Усё залежыць толькі ад настрою і маральнага духу самога спартсмена. Так, можна скласці рукі і сказаць, што калі няма стартаў, то і працаваць не трэба. Але і вынік гэтага рашэння будзе адпаведны. А калі трэніравацца, верыць у сябе і свайго трэнера, то можна пераадолець усе наступствы спартыўнага крызісу.

— Вас з кабінета не цягне паспаборнічаць, напрыклад, у якасці трэнера?

— Часам мне здаецца, што мая спартыўная кар'ера была ў мінулым жыцці. Я займаюся для сябе фізічнай культурай: бег, веласіпед, плаванне, часам лыжы. Каб праявіцца як трэнер, трэба гэтым жыць, жыць на зборах і спаборніцтвах. Праездзіўшы паўжыцця на зборы і спаборніцтвы, я, мабыць, не гатовы прысвяціць гэтаму яшчэ паўжыцця. Можна прыносіць карысць спорту і ў іншай ролі.

Валерыя СЦЯЦКО.

Магілёў.

З нагоды

ГЕРАІЧНАЯ ВАСЬМЁРКА НА ШЛЯХУ Ў ПАРЫЖ

Хто прадставіць Беларусь на Паралімпійскіх гульнях

Алімпійскія гульні, якія нядаўна завяршыліся ў Парыжы, далі столькі падстаў для абмеркавання, што ўспамінаць іх, верагодна, будуць доўга. А ўжо 28 жніўня стартуе падзея, якая дасць не менш інфармацыйных нагод. Вядома, хацелася б, каб былі яны выключна спартыўныя. У Парыжы адкрываюцца XVII летнія Паралімпійскія гульні, у праграме якіх 22 віды спорту. Каля 4400 спартсменаў са 182 краін разыграюць 549 камплектаў узнагарод. Сярод іх, няхай і ў нейтральным статусе, і беларусы. За плячыма кожнага з іх — столькі выпрабаванняў, што было б недарэчна думаць: санкцыі, пераменлівая і нявызначаная пазіцыя Міжнароднага паралімпійскага камітэта зламаюць іх баявы дух. Зразумела, невядомасць, дапусцяць ці не, праверкі на нейтральнасць, — нервы патрапалі, але не зламілі. І ў Парыж едуць восем найлепшых беларускіх паралімпійцаў. Так, гэта самая малалікая дэлегацыя Беларусі за ўсю гісторыю. Але справа зусім не ў колькасці. Хто прадставіць краіну на галоўных стартах чатырохгоддзя, расказаў генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта Мікалай ШУДЗЕЙКА.

Мікалай ШУДЗЕЙКА.

ЗА КАГО БАЛЕЦЬ У ПАРЫЖЫ

Беларусы ў Францыі будуць спаборнічаць у двух відах — плаванні і лёгкай атлетыцы. Гэта тыя самыя віды спорту, якія заўсёды прыносілі медалі. Ніякіх намёкаў, проста факты. Плыўцы адправяцца ў Парыж цэлым дэсантам пад кіраўніцтвам нязменнага генсека — галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Генадзя Вішнякова, якому дапамагае Станіслаў Паздзееў. Каманда сапраўды вельмі моцная. Хаця б таму, што ў складзе 16-разовы паралімпійскі чэмпіён Ігар Бокій. Спартсмену ўжо 30 гадоў, але ён па-ранейшаму застаецца наймацнейшым у сваім класе, што радуе балельшчыкаў, і надзвычай сціплым, што засмучае журналістаў. Асабліва прыемна, што Ігару ўжо расце змена. Адзіны неабстраляны спартсмен у беларускай камандзе ў Парыжы — Яўген Кавалёнак, які трэніруецца ў Бабруйску ў першага трэнера Ігара Бокія Наталлі Пазняковай. «Малады перспектыўны хлопец, які ўжо паўдзельнічаў у міжнародных спаборніцтвах, паказвае нядрэнныя вынікі. Мы спадзяёмся, што ён складзе канкурэнцыю наймацнейшым плыўцам і працягне бабруйскія традыцыі плавання. Ігар Бокій пакуль расставацца са спортам не плануе, але і змену яму трэба рыхтаваць. Вось і праверым Яўгена Каваленку ў баі», — адзначае Мікалай Шудзейка.

Таксама ў Парыж адпраўляецца сярэбраны прызёр Гульняў у Токіа Ягор Шчалканаў. Тры гады таму яго сярэбраны медаль на стометроўцы на спіне стаў сюрпрызам для многіх. Бо нават галоўны трэнер зборнай Генадзь Вішнякоў яшчэ да Токіа казаў, што там Шчалканаву думаць пра медалі не варта, яго Паралімпіяда будзе ў 2024 годзе ў Парыжы. І калі Ягор паказаў выступленне, якога не чакалі, то на што ён здольны на «сваёй» Алімпіядзе? Дарэчы, сам Ягор у інтэрв'ю пасля Токіа казаў, што плаванне на спіне — не яго стыль. «Я яшчэ не плаваў такую дыстанцыю. Першы раз праплыў яе ў 2019 годзе, і мы тады вырашылі, што спіна не для мяне. Я не трэніраваў яе. Пакуль аднойчы на чэмпіянаце Беларусі не паказаў сярэдні вынік. І вырашылі паспрабаваць выйсці на гэтую дыстанцыю да чэмпіянату Еўропы. У выніку заняў трэцяе месца. Ну, і трэніраваў гэтую дыстанцыю да Паралімпійскіх гульняў. Але чаму там усё так добра склалася, я растлумачыць не магу», — дзеліўся Ягор у інтэрв'ю «Звяздзе». А, зрэшты, ці патрэбны гэтыя тлумачэнні?

Анастасія Зудзілава таксама была на Гульнях у Токіа. Але тады яе найлепшым вынікам было пятае месца. Цяпер ёсць добры шанц узяць рэванш. Відавочна, такім жа шанцам напоўніцу скарыстаецца Максім Вашкевіч. Тры гады таму ў Токіа ён здаў станоўчы тэст на каранавірус, таму змог выйсці на старт толькі адной дыстанцыі, на якой стаў сёмым. У Дзмітрыя Салея спартыўная біяграфія надзвычай насычаная: ён паралімпійскі чэмпіён 2008 года. З 2013 да 2018-га выступаў за Азербайджан, але перад Паралімпійскімі гульнямі ў Токіа вярнуўся ў родныя пенаты. «Кожны з плыўцоў патэнцыяльна гатовы ўзяць медалі. Спартсмены моцныя, здольныя. Будзем спадзявацца, што поспех павернецца да іх тварам і ўсё для іх складзецца добра», — дзеліцца Мікалай Шудзейка.

У лёгкаатлетаў прадстаўніцтва больш сціплае, але затое якое! Лізавета Пятрэнка ў Токіа заняла трэцяе месца ў кіданні кап'я. Прычым у Японіі яна выступала з траўмай — на трэніроўцы падвярнула галёнкаступ. «Калі трапляеш на Паралімпійскія гульні, павінен выкласціся на ўсе сто і зрабіць усё магчымае, каб трапіць у тройку найлепшых. Таму «бронза» на Гульнях — гэта вельмі добра, але мы робім упор на «золата», — адзначаў пасля Токіа трэнер Лізаветы Ігар Фартуноў. У гэтага тандэма грандыёзныя планы на будучыню і вялізнае жаданне іх рэалізаваць. Інакш і не можа быць. Ігар Фартуноў — дзевяціразовы чэмпіён свету, уладальнік пяці паралімпійскіх медалёў, у тым ліку і залатога. Сёння легендарны спартсмен перадае свае веды і досвед маладым атлетам. Як ён гэта робіць — усе бачылі ў Токіа ў сектары кідання кап'я. Хочацца ўбачыць і ў Парыжы. Дарэчы, за апошнія тры гады Лізавета паспела выйсці замуж і змяніць прозвішча з Пятрэнка на Дабравольскую, а таксама папоўніла і сваю медальную скарбонку. «Ліза заваявала бронзавы медаль чэмпіянату свету ў маі. Тэхнічна выступіла неідэальна, але быў час, каб удасканаліць тэхніку. Спадзяёмся, што на Паралімпійскіх гульнях яна будзе ў поўнай баявой гатоўнасці, мы на яе вельмі разлічваем», — падкрэслівае Мікалай Шудзейка.

Не першая Паралімпіяда і для Уладзіслава Грыба. Разам з трэнерам Дзянісам Васілевічам яны першапраходцы. Займаюцца кіданнем булавы — дысцыплінай, якая, нягледзячы на традыцыі ў беларускай паралімпійскай лёгкай атлетыцы, яшчэ прадстаўлена не была. У Токіа Уладзіслаў заняў шостае месца. А ў Парыжы, акрамя спаборніцтваў па кіданні булавы, выступіць яшчэ і ў кіданні дыска, у гэтай дысцыпліне ён нават устанавіў рэкорд Еўропы, праўда, з-за бюракратычных затрымак яго не зарэгістравалі. «Для Улада гэта ўжо другая паралімпіяда, ён выступаў на кваліфікацыйных спаборніцтвах, чэмпіянаце свету — вопыт у яго салідны. Але спорт не стаіць на месцы, сапернікі ўдасканальваюцца. А Уладу трэба папрацаваць псіхалагічна. На трэніроўках, на ўнутраных стартах ён паказвае дастойныя вынікі. А на міжнародных спаборніцтвах пачынаецца мандраж, а разам з ім і праблемы. З-за гэтага на чэмпіянаце свету ён не поўнасцю раскрыў свой патэнцыял. Але ва Улада і Дзяніса склаўся добры тандэм, і разам яны павінны вырашыць усе праблемы», — упэўнены Мікалай Шудзейка.

КАГО Ў ПАРЫЖЫ НЕ ЎБАЧЫМ

Упершыню за шмат гадоў у складзе беларускай дэлегацыі не будзе фехтавальшчыкаў, што вельмі засмучае. «У кожным відзе спорту ёсць свае крытэрыі адбору на Паралімпіяду. Мы разлічвалі на ліцэнзіі ў фехтаванні і паўэрліфтынгу. Але з-за санкцый нашы спартсмены не змаглі выступіць на ўсіх адборачных стартах, таму і засталіся без ліцэнзій. Вельмі крыўдна, бо ў фехтаванні сабралася моцная каманда дзяўчат, паралімпійскі чэмпіён Андрэй Праневіч таксама ў страі», — распавядае Мікалай Шудзейка.

У паўэрліфтынгу Дзмітрый Ходас ад старту да старту паляпшае вынікі і мог бы выступіць у Парыжы. Для яго гэтыя Гульні маглі б стаць кульмінацыяй цярністага шляху. У 2019 годзе на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы па цяжкай атлетыцы на хлопца, які ішоў на рэкорд, упала штанга вагой 146 кілаграм. З таго часу хлопец не можа хадзіць. Але можа паднімаць штангу — з 2021 года Дзмітрый займаецца паралімпійскім паўэрліфтынгам. «Дзіма малады, перспектыўны хлопец, канкурэнтаздольны стабільны спартсмен. Яму вельмі на руку (ва ўсіх сэнсах) падрыхтоўка ў цяжкай атлетыцы, таму высокія вынікі ён яшчэ абавязкова пакажа. Дзіма ўжо пераадолеў крызіс траўмы, псіхалагічна стабілізаваўся, зразумеў, што жыццё не скончылася. На чэмпіянаце Еўропы, які прынёс яму траўму, ён не змог падняць 146 кілаграм, нядаўна пераадолеў гэтую планку і падняў 147. Будзем спадзявацца, што больш нічога яго не зламае», — разважае Мікалай Шудзейка.

Не выступяць у Парыжы і весляры на байдарках і каноэ. І прычына больш чым абсурдная. Анастасія Мяснікова і Крысціна Сульжыцкая ў сумленнай спартыўнай барацьбе заваявалі ліцэнзіі на чэмпіянаце свету. Але ў сувязі з асаблівасцямі кваліфікацыі на Гульні, абумоўленай сістэмай спартыўнай медыцынскай класіфікацыі (якую павінны праходзіць усе дэбютанты паралімпійскіх спаборніцтваў), дзяўчаты выступіць у Парыжы не змаглі. Міжнародная федэрацыя веславання на байдарцы і каноэ з-за бюракратычнай цяганіны не выдзеліла ліцэнзіі нашым спартсменкам.

Можна ўявіць, які гэта ўдар — імкнуцца на Паралімпійскія гульні, трэніравацца на знос, каб па зусім неспартыўных прычынах, «праляцець як фанера над Парыжам». Але яны прафесіяналы, таму ў сітуацыі, у якой любы іншы апусціў бы рукі, сабралі волю ў кулак і пайшлі на трэніроўку, каб стаць яшчэ мацнейшымі. Да таго ж прагрэс ёсць: ад поўнага бана дайшлі да допуску на міжнародныя спаборніцтвы. А Алімпійскія гульні ў Парыжы паказалі, што ад удзелу беларусаў сусветны спорт не абваліўся. Дык ці сапраўды патрэбны гэтыя санкцыі?

«Мяркую, пасля гэтай паралімпіяды будуць перагледжаны і крытэрыі адбору, і стаўленне да нашай краіны ўсімі міжнароднымі арганізацыямі і ўрадамі. І, думаю, неўзабаве мы зажывём нармальным жыццём, уздыхнём на поўныя грудзі і будзем на роўных выступаць на ўсіх спаборніцтвах і ў сумленнай барацьбе перамагаць», — глядзіць у будучыню з аптымізмам генеральны сакратар Нацыянальнага паралімпійскага камітэта.

ЧАМУ НЕ ВАРТА АПУСКАЦЬ РУКІ

Зрэшты, нагоды для аптымізму ёсць. Ніхто з лідараў паралімпійскага спорту кар'еру не скончыў, усе застаюцца ў страі. І пры гэтым расце змена. «У нас з'явілася шмат таленавітых, перспектыўных спартсменаў. Напрыклад, у фехтаванні ёсць новыя імёны:

Уладзіслаў ГРЫБ.

Яна Шлыкава, Каця Мышкова падаюць надзеі, ужо выступалі на міжнародных стартах. У лёгкай атлетыцы ідзе змена пакаленняў, прыходзіць моладзь. Ганна Канюк у Гродне разгарнула бурную трэнерскую дзейнасць, сабрала немаленькую групу. Плаванне не здае пазіцый. Ёсць энтузіясты, гатовыя працаваць не шкадуючы сіл. Напрыклад, Радзівон Сініцын у Бабруйску кожны дзень носіць сваіх вучняў на руках у басейн і назад, бо ванна басейна знаходзіцца на другім версе. На такіх людзях усё і трымаецца. Вялікай падмогай для развіцця спорту, вядома, з'яўляецца работа Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відах спорту. Але ўсё ж вельмі засмучае, што няма спартыўнага комплексу для паралімпійцаў — з безбар'ерным асяроддзем на спартыўных пляцоўках, з інтэрнатам, каб людзі з іншых гарадоў маглі з камфортам жыць і трэніравацца. Думаю, з часам гэтая праблема вырашыцца», — распавядае Мікалай Шудзейка.

А, зрэшты, беларускія паралімпійцы вырашылі ўжо столькі праблем, што можна не сумнявацца: усё ў іх атрымацца і ў Парыжы, і пасля яго.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	УП «Лаздуны-Агро», Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны 1, ул. Советская, д. 1. УНП 592001055
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов:
бывшая в употреблении сельхозтехника.
Месторасположение: **Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны**

Лот, №	Марка, модель	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	**Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв. № 14987	**6 178,49**
2	**Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв. № 14988	**6 178,49**
3	**Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180,** 2019 г. в., инв.№ 14989	**6 178,49**
4	**Комбайн кормоуборочный КВК 800-36,** 2014 г. в., инв. № 3184	**54 861,88**
5	**Агрегат почвообрабатывающе-посевной АПП-6Д,** 2013 г. в., инв. № 3339	**14 373,86**
6	**Захват рулонов ПМС-0,8,** 2014 г. в., инв. № 39	**363,65**
7	**Удлинитель стрелы ПМС-0,8,** 2014 г. в., инв. № 47	**1 161,15**

Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота
Цена снижена на 60 %

Условия торгов: все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона
Условия оплаты предмета электронных торгов	**10 (десять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от 6 % до 10 % от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» 30.07.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
с 11.00 до 12.00 10.09.2024.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.09.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны:
+375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества, принадлежащего
УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»
Минская дистанция гражданских сооружений
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

Аукцион состоится **20.09.2024 в 11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

Часть пола площадью 1,0 кв. м, расположенная в кассовом павильоне с инв. № 600/С-152616.

Адрес:
Минская обл., Минский район, Сеницкий с/с, ст. Колядичи.

Срок договора аренды – 5 лет.

Начальная цена с НДС 20 % – 4,44 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ООО «Фрондера»
извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Производственная компания Ромакс»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Грузовой фургон MERCEDES-BENZ ATEGO 815, рег. знак АЕ 5432-4, кузов (рама) № WDB9700151L088714, 2005 г. вып.	76 896,00	7 689,60	3 844,80
2	Грузовая платформа тентовая SCANIA R420L B6X2MNA, рег. знак АЕ 5558-4, кузов (рама) № XLER6X20005158643, 2006 г. вып.; прицеп-платформа тентовая WECON AWZ218LZ, рег. знак А 7574 А-4, кузов (рама) № W09AWZ2186AW35129, 2006 г. вып.	95 580,00	9 558,00	4 779,00
3	Автомобиль грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER FT 440, рег. знак АМ 9817-4, кузов (рама) № VF3EZMFC12305803, 2012 г. вып.	36 360,00	3 636,00	1 818,00
4	Автомобиль грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER, рег. знак АМ 9825-4, кузов (рама) № VF3YEBMFC12023546, 2011 г. вып.	31 320,00	3 132,00	1 566,00

В отношении лотов №№ 1, 2 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 139 (30273) от 19.07.2024, стр. 14.
В отношении лотов №№ 3, 4 проводятся первые торги

В отношении лотов имеется ограничение (обременение) в виде залога. Дополнительная информация по тел. +375295767715 (Юлия)

Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Калиновского, 117

Дата и время проведения торгов	**В отношении лотов №№ 1, 2: 9 сентября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55).** **В отношении лотов №№ 3, 4: 26 сентября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	В отношении лотов №№ 1, 2: с 10.00 26 августа 2024 года до 16.00 5 сентября 2024 года. В отношении лотов №№ 3, 4: с 10.00 26 августа 2024 года до 16.00 24 сентября 2024 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Производственная компания Ромакс», проводимых __.__.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1, 2 – 6 %, по лотам №№ 3, 4 – 7 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ООО «Производственная компания Ромакс»** **в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 576-77-15 (Юлия)** **(Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Липнишки, ул. Виленская, 12А, комн. 2В, УНП 590718744)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97** **• e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «ЦветУпак»** (Продавец)

Электронные торги состоятся 24.09.2024.

Лот № 1. Производственное здание с инв. № 610/С-28481, 1450,60 кв. м. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 42/6.
Начальная цена с НДС 20 % – 65 160,00 руб.
Задаток – 6 516,00 руб.

Лот № 2. Финский склад с инв. № 610/С-28489, 872,00 кв. м. Адрес: Минская область, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 42.
Начальная цена с НДС 20 % – 44 160,00 руб.
Задаток – 4 416,00 руб.

Лот № 3. Г 2/к. Здание склада с инв. № 500/С-23571, 275,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/7.
Начальная цена с НДС 20 % – 193 200,00 руб.
Задаток – 19 320,00 руб.

Лот № 4. Б 1/к. Здание сварочного отделения с инв. № 500/С-18827, 183,00 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/9.
Начальная цена с НДС 20 % – 202 440,00 руб.
Задаток – 20 244,00 руб.

Лот № 5. Н 2/К. Здание для сторожей с инв. № 500/С-24429, 42,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/ 5.
Начальная цена с НДС 20 % – 27 600,00 руб.
Задаток – 2 760,00 руб.

Лот № 6. Здание гаражей с инв. № 500/С-26665, 89,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/2.
Начальная цена с НДС 20 % – 46 080,00 руб.
Задаток – 4 608,00 руб.

Лот № 7. К 1/к. Здание диспетчерской с контрольно-пропускным пунктом и помещением для начальников автоколонн с инв. № 500/С-19311, 272,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33.
Начальная цена с НДС 20 % – 170 280,00 руб.
Задаток – 17 028,00 руб.

Лот № 8. Л 1/к. Здание мехмойки с инв. № 500/С-22506, 498,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца 33/1.
Начальная цена с НДС 20 % – 478 320,00 руб.
Задаток – 47 832,00 руб.

Лот № 9. Д 1/к. Здание склада с инв. № 500/С-19312, 495,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/6.
Начальная цена с НДС 20 % – 441 600,00 руб.
Задаток – 44 160,00 руб.

Лот № 10. Е 1/к. Здание автозаправочной станции с инв. № 500/С-7808. 72,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/4.
Начальная цена с НДС 20 % – 27 600,00 руб.
Задаток – 2 760,00 руб.

Лот № 11. М1/к. Вспомогательное здание с инв. № 500/С-24045, 238,0 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Казинца, 33/3.
Начальная цена с НДС 20 % – 220 800,00 руб.
Задаток – 22 080,00 руб.

Обременения по Лотам №№ 3–11: аренда.
Капитальные строения с инв. № 610/С-28481 и № 610/С-28489 расположены на земельном участке 640400000001000913, 3,0318 га. Право аренды. Доля: 20/100.
Капитальные строения с инв. №№ 500/С-23571, 500/С-18827, 500/С-24429, № 500/С-26665, 500/С-19311, 500/С-22506, 500/С-19312, 500/С-7808, 500/С-24045 расположены на земельных участках №№ 500000000004001387 (право постоянного пользования, 2,6046 га), 500000000004005404 (право аренды, 0,1870 га), 500000000004005405 (право аренды, 0,1136 га). Доля: 1/2.
На земельных участках расположены иные объекты, которые не выставлены на электронные торги. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатками: 19.09.2024 в 16.00.

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by
Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

УНП 190055182

Первичная профсоюзная организация производственного коммунального унитарного предприятия «МИПП» ликвидируется в связи с реорганизацией производственного коммунального унитарного предприятия «МИПП».

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220006, г. Минск, ул. Ульяновская, 31А.

УНП 100799172

У ЧЫМ СУСТРЭНЕМ ВОСЕНЬ?

Натхняемся самай прыгожай парой года

Гэтай восенню дызайнеры і стылісты раяць адмовіцца ад «культу рэчаў» і празмернага спажывання, а ствараць лагічныя і зразумелыя вобразы пад дэвізам «пазбаўляемся ад непатрэбнага». Выццё стала занадта складаным, каб ускладняць яшчэ і вобразы, пераконваюць нас прафесіяналы свету моды, і мы ад душы з імі пагодзімся. Ну а як дадаць у свой просты восеньскі вобраз модную разыначку, зараз раскажам.

Сумаваць з нагоды адыходзячага лета і надыходу восені — частка нашай ментальнасці: тое, што з дзяцінства выхоўваецца (у тым ліку праз творы беларускай і рускай літаратуры са школьнай праграмы) і ў грамадстве вітаецца. Але аб чым тут сумаваць? Па-першае, ранняя восень (пакуль свеціць сонейка і не пайшлі зацяжныя дажджы), мабыць, — самая прыгожая пара года ў нашай сярэдняй паласе. І, па-другое, гэта выдатная нагода, каб у ідэале хаця б злёгку абнавіць гардэроб. А калі на гэта няма сродкаў, натхнення або і таго, і другога, можна, уступіўшы ў шэрагі адэптаў разумнага спажывання, паспрабаваць скамбінаваць ужо наяўныя «луівітоны» (нават калі яны родам з найбліжэйшага рэчавага рынку) у новых вобразах і прачытаннях.

ВІШАНЬКА НА ТОРЦЕ

Галоўныя колеры надыходзячага сезона відавочныя для тых, хто сочыць за трэндамі. І гэта — чырвоная гама: у першую чаргу бардо, вінны, вішнёвы. У гэтыя тоны стылісты «фарбуюць» усё, да чаго могуць дацягнуцца: блэйзеры і пінжакі, спадніцы мідзі, міні і максі, верхняе адзенне і сумкі, штаны і ўпрыгожванні, брутальную скуру (MSGM, Khaite) і бязважкі шыфон (Saint Laurent). Зрэшты, неабавязкова «аблівацца вішнёвым сіропам» з галавы да ног, можна выкарыстоўваць трэндавы колер толькі ў акцэнтах і дэталях. Напрыклад, дадаць у вобраз

актуальныя, падкрэслена простага дызайну красоўкі ў вішнёвым ці чырвоным колеры. А самы бюджэтны спосаб надаць вобразу вастрыні — бардовыя (чырвоныя) калготкі. Каляровыя калготкі — у цэлым трэнд гэтай восені. І асабліва актуальныя, як вы, мусіць, ужо здагадаліся, чырвоныя, вінныя, бардовыя, вішнёвыя. Прыйшлі на подыумы, а з іх — на вуліцы, чырвоныя калготкі яшчэ мінулай зімой, беларускія модніцы пачалі насіць іх вясной. І будучай восенню трэнд, здаецца, стане мэйнстрымам. Хоць калі дызайнеры яго толькі прапаноўвалі, то не прадракалі яркім калготкам вялікую будучыню. І памыліліся — народу спадабалася. Зрэшты, актуальныя будуць не толькі калготкі ў чырвонай і бардовай каляровай гаме, але і зялёныя (у прыватнасці, хакі), жоўтыя, белыя, фіялетавыя, карычневыя і насычана-шэрыя.

Ну а калготкі ў вінных тонах камбінаваць варта з актуальным шэрым, як мы гэта рабілі мінулай вясной: спакойны шэры ўраўнаважвае выбуховы характар чырвонай гамы і вобраз атрымліваецца арыстакратычным і вытанчаным.

Сумкі ў восеньскім сезоне актуальныя вялікія. Ёмістыя тоўты, якія прыйшлі на змену мікрасумкам яшчэ некалькі сезонаў таму, але пакуль заставаліся незаслужана недаацэненымі, здаецца, нарэшце завалодаюць свет. Бо гэта адзін з самых практычных трэндаў. Актуальныя шоперы са скуры або замшы.

НАЗАД У БУДУЧЫНЮ

Дарэчы, аб замшы. І ўвогуле пра 1970-я. Менавіта імі — культурай музыкаў і мастакоў тых часоў, а таксама субкультурай хіпі — натхняліся дызайнеры, ствараючы калекцыі для гэтай восені і зімы. Так што калі на гарышчах і антрэсолях завалялася нешта з мамінай ці нават бабулінай маладосці (а раптам?) — смела дастаём: рэч можа аказацца дарэчы. Кароткія сукенкі А-сілуэта (як у жонкі вынаходніка Шурыка ў «Іван Васільевіч змяняе прафесію» ці спадарожніцы рэжысёра Якіна, якая марыла паляцець з ім у Гагры), а таксама А-сілуэта спадніцы рознай даўжыні, шыфон і стракатыя кашулі, туфлі на масіўным абцасе з квадратнымі насамі і раменьчыкамі, штаны клёш (іх дызайнеры спрабавалі ўкараніць у масы яшчэ некалькі сезонаў назад, але тады яны чамусьці модніцам не палюбіліся)... І, вядома, замша: дублёнкі, сумкі, спадніцы і наогул любыя вырабы з гэтага матэрыялу будуць на грэбні моднай хвалі.

Зрэшты, ваш замшавы вобраз можа быць вырашаны і элементамі каўбойскага стылю. Нараўне з падкрэслена мінімалістычнага дызайну красоўкамі самым трэндавым абуткам восеньскага сезона стылісты называюць высокія «казакі», яны ж «каўбойскія боты». Стылізаваць іх рэкамендуецца з прыталенымі жаноцкімі сукенкамі або джынсамі (асабліва актуальна — з джынсавым total look). Бахрама, замшавыя кашулі ў бэжавых тонах, замшавыя ж пінжакі ў колеравай гаме «шакалад» і курткі ў не менш актуальным хакі — усё гэта можна ўбачыць, паглядзеўшы фота і відэа з восеньскіх паказаў.

Сюды ж, у 1970-я, адсылае нас і стыль боха, які будзе актуальны восенню і зімой. Дадаць у вобраз багемнай рамантыкі дапамогуць блузы з аб'ёмнымі рукавамі. Насіць іх рэкамендуецца з джынсамі і бацільёнамі, а таксама ў якасці ніжняга пласта пад аверсайз-світар — каўнер, манжэты і падол блузы павінны выглядваць. Але і класічнага крою штаны і лодачкі блузе ў стылі боха — годныя партнёры. А калі хочацца эклектыкі, спалучаем рамантычны верх з актуальным нізам са скуры (якая ўвосень таксама на модным Алімпе) — спадніцай ці штанамі. Можна аддаць даніну стылю боха і ўсяго толькі з дапамогай аксэсуараў — буйных завушніц-калец або доўгіх падвесак.

КУРС НА ПАХАЛАДАННЕ

Экаскура цалкам чакана перавандравала з вясновага сезона – 2024 у восеньскі. Прычым дызайнеры неверагодна актыўна выкарыстоўвалі гэты матэрыял у сваіх калекцыях для будучага халоднага сезона: са скуры (штучнай і нават натуральнай, хоць гэта цяпер многія лічаць маветонам) ствараліся курткі і пінжакі, штаны і спадніцы, паліто і плашчы, камізэлькі і нават гальштукі. Сярод фаварытаў — класічны варыянт (чорная скура), а таксама варыянт трэндавы (чырвоныя і вінныя адценні) і насычаныя карычневыя тоны. Фактуры вітаюцца розныя: матавыя, глянцавыя, з цісненнем.

Восень — час утульных світараў. І ў гэтым сезоне абіральныя аб'ёмныя мадэлі: яны былі, як кажуць модныя блогеры, «на хайпе» пару сезонаў назад і цяпер вяртаюцца. Паколькі гаворка ідзе пра восень, то непазбежна будзе станавіцца ўсё халадней і халадней. Прастату, утульнасць і функцыянальнасць дызайнеры ўвасобілі ў світары з высокім горлам. Прычым на піку папулярнасці — рэчы, якія імітуюць ручную вязку, а ў ідэале — уласна, ручной работы. Калі вяжаце — бярыцеся за спіцы. Калі не — папрасіце маму або бабулю звязаць вам, і гэты прадмет гардэроба стане модным акцэнтам восені.

Застаецца з намі шматслойнасць — трэнд, які трымаецца ўжо не адзін сезон і выдатна падыходзіць для сырой беларускай

позняй восені і зімы. На правілах стварэння шматслаёвага вобраза мы неяк спыняліся. Цяпер толькі нагадаем, што самы просты спосаб — вытрымліваць прынцып «Чым бліжэй да цела, тым танчэйшы пласт». Можна і па-іншаму, але гэта больш складана і патрабуе некаторай нагледжанасці.

Актуальны дзелавыя касцюмы са штанамі або спадніцай рознай даўжыні, пінжакі і асабліва клетка. У будучым сезоне ў клетачку (прычым клетка можа быць розных памераў і колераў) не толькі кашулі, але і паліто, штаны, спадніцы, касцюмы, пінжакі і аксэсуары.

А паліто і плашчы гэтай восенню ў модзе кароткія, і што, як мне падаецца, сумна (хоць многім, вядома, трэнд спадабаецца). Мы ўжо паспелі прывыкнуць да доўгіх, да пят, досыць аб'ёмных мадэляў, якія выцягваюць сілуэт і здольныя схаваць пад сабой і лішнія аб'ёмы, і непрадуманы вобраз. На жаль, іх час сыходзіць. На змену прыходзяць мадэлі кароткія — да сярэдзіны сцягна (як павінны выглядаць такія сілуэты, можна падгледзець у калекцыях Prada або Ferragamo) і нават да таліі (натхняемся паказамі Miu Miu). Дарэчы, такія кароткія мадэлі ўжо актыўна прапаноўвае масмаркет. Калі падабаецца — прымяраем.

САПРАЎДНАЯ ЛЭДЗІ

Пасля некалькіх сезонаў аверсайза, свабодных джынсаў і доўгіх кашуль на выпуск, футурызму і стылістыкі 1990-х, пасля некалькіх гадоў у стылі «каралева бензакалонкі» модны маятнік хіснуўся ў іншы бок. Мода ўзяла курс на жаноцкасць. Папулярныя спадніцы lady like, прыталены крой (хоць аверсайз пакуль што таксама не здае пазіцый). Вяртаючыся да вечных ісцін, сусветныя брэнды прадставілі шырокай грамадскасці жаноцкія сілуэты сукенак, пінжакоў, паліто. Гэтай восенню нам раяць часцей апранаць спадніцы: штаны няхай носяць мужчыны — у прамым і пераносным сэнсе. А мы будзем дзяўчатамі! Вітаецца «офісная» даўжыня мідзі, не губляюць актуальнасці вузкія спадніцы максі. А яшчэ гэты сезон адзначаны трыумфальным вяртаннем даўжыні міні (хоць, уласна кажучы, міні-спадніцы вярнуліся на подыумы ўжо некалькі сезонаў таму). Ну, а калі хочаце моднай разыначкі, сшыйце сабе спадніцу... з дзіцячага пакрывала або накідкі на канапу. Жартую, вядома. Але найболей актуальныя ў гэтым сезоне, па меркаванні шэрагу вядомых дызайнераў (Carven, Sandy Liang), міні і мідзі з тканін незвычайных фактур. Наўрад ці такую сустрэнеш у масмаркеце, але можна ўспомніць школьныя ўрокі працоўнага навучання, купіць фактурную тканіну, узброіцца нажніцамі, дастаць з далёкага кута забытую швейную машынку... Зразумела, для адважных, але калі правільна стылізаваць такую рэч, ваш вобраз атрымаецца яркім і цікавым.

Застаецца актуальнай гэтай восенню празрыстасць (цяпер празрыстымі могуць быць не толькі ўжо лангслівы і спадніцы, але і кашулі строгага класічнага крою). Карысны элемент гэтай восені з падкрэслена жаноцкага арсенала моды — карункі. Спалучаць карункавыя рэчы, каб «прыгасіць» іх гуллівы характар, стылісты рэкамендуюць з рэчамі строгімі, дзелавога стылю (як гэта рабіць, паказалі дызайнеры Valentino). І яшчэ адна дэталь, якую вітае мода гэтай восені, — банты. Пачалі насіць іх на сукенках, блузах і нават у валасах мы гэтым летам, і з надыходам восені яны застануцца з намі. Прычым упрыгожваць бантамі дызайнеры раяць нават паліто і світары.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ТЭАТРАЛЬНЫ ЛЁС МІНСКАЙ ГІМНАЗІСТКІ

Штрыхі да партрэта Лідзіі Ржэцкай

Запісы ў працоўнай кніжцы гэтай актрысы змяшчаюцца на дзвюх старонках.
21 чэрвеня 1921 года «зачислена артисткой драмы» ў Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр.
28 снежня 1938 года прысвоена званне заслужанай артысткі БССР, у снежні 1943-га — званне народнай артысткі БССР.
У сакавіку 1952-га стала лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі за ўдзел у спектаклі «Пяюць жаваранкі» па п'есе Кандрата Крапівы.
Люты 1955 года — званне народнай артысткі СССР.
24 кастрычніка 1977 года — выбыла са складу тэатра ў сувязі са смерцю.
Вось і ўсе запісы. Старонак, на якіх пералічваюцца ўзнагароды і прэміі, значна больш.
Праўда, яшчэ значыцца, што перад залічэннем у склад тэатра ўладальніца працоўнай кніжкі Лідзія Іванаўна Ржэцкая мела працоўны стаж пяць гадоў.
Давайце палічым... Нарадзілася артыстка ў 1899-м, значыць, павінна была пачаць працу ў сямнаццаць... Няўжо адразу на сцэне? Як жа гэта адбылося?

УЦЁКІ НА СЦЭНУ ДАЧКІ СВЯТАРА

У Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, дзе я пагартала працоўную кніжку Лідзіі Ржэцкай, захоўваецца і яе аўтабіяграфія, напісаная ад рукі на развароце аркуша, вырванага з вучнёўскага сшытка.

«Родилась 6 апреля 1899 года в г. Минске. Окончила 8 классов Минской Мариинской гимназии в 1916 году. Окончив гимназию, сразу же поступила в украинский коллектив под рук. Чухлiба, гастролировавший в это время в Минске».

У выразы з «Сельскай газеты» ад 5 красавіка 1974 года з артыкулам, прысвечаным 75-годдзю Лідзіі Ржэцкай, чытаем, як у паслярэвалюцыйныя гады амаль на кожнай афішы БДТ-1 было імя Лідзіі Ржэцкай, *«тогда совсем еще юной девушки, дочери минского железнодорожника, пришедшей на профессиональную сцену из художественной самодеятельности».*

Даволі распаўсюджаныя звесткі. Але ўсё патрабуе супастаўлення і пацвярджэння.

Насамрэч бацькам Лідзіі быў святар Іаан Ржэцкі, пра што пры савецкай уладзе, зразумела, лепей было змаўчаць. Недарэмна Лідзія вучылася ў Марыінскай жаночай гімназіі. Адукацыя давалася выдатная, выпускніцы атрымлівалі права працаваць хатнімі настаўніцамі і паступаць на Вышэйшыя жаночыя курсы без іспытаў. Разам з Ржэцкай, дарэчы, на сцэне БДТ-1 іграла яшчэ адна выпускніца Марыінскай гімназіі — Вера Пола.

Па суседстве з юнай гімназісткай Лідзіяй Ржэцкай жыў малады тэлеграфіст Уладзімір Крыловіч, адзін з будучых стваральнікаў беларускага тэатра і таксама акцёр БДТ-1. Маладыя людзі сябравалі, Уладзімір вадзіў Лідзію на ўсе тэатральныя прадстаўленні — у Мінск нярэдка прыязджалі гастралёры. Гісторыя, якая адбылася, здаецца выдуманай — сапраўдны сюжэт для мюзікла. Галоўная актрыса захворвае, падмяніць яе просяць маладзенькую, нікому не вядомую дэбютантку, і на вачах уражанай публікі запальваецца новая зорка... Але так і адбылося. Гастралёры паказвалі спектакль «Няшчаснае каханне», выканаўца галоўнай ролі захварэла. Яе падмяніла гімназістка Лідзія Ржэцкая... Відаць, дзякуючы тэатралу Крыловічу, маладых людзей добра ведалі ў заезджай трупе.

Пасля бліскучага дэбюту Лідзію запрасілі ў трупу. Так фактычна пачалася яе прафесійная тэатральная дзейнасць. Бацька-святар, кажуць, не блаславіў, да канца жыцця не мог дараваць дачцэ ўцёкі на сцэну.

Час быў бурлівы... На фоне палітычных перамен у Беларусі адраджалася нацыянальная культура. У 1917-м Лідзія Ржэцкая, відаць, дзякуючы таму ж Крыловічу, трапіла ў «Беларускую хатку», Тэатр беларускай драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Фларыяна Ждановіча. Там сабраліся легендарныя асобы, будучыя зоркі беларускага тэатра. Лідзія Ржэцкая іграла Зоську ў «Раскіданым гняздзе» Янкі Купалы, Пронку ў «Зімовым вечары» Элізы Ажэшкі...

«МЫ АДПРАЎЛЯЛІСЯ НА ФРОНТ...»

Але тэатр перапыніў дзейнасць. Інтэрвенцыя немцаў, польская акупацыя... У 1919-м Ржэцкая паехала ў Маскву, вучылася ў вячэрняй студыі Пралеткульта пад кіраўніцтвам Валянціна Смышляева. Затым з'ехала ў Башкірыю — у аўтабіяграфіі напісана «па сямейных абставінах», і гэта было каханне. Але першы муж, хімік Міхаіл Аляксееў, памёр, калі іх дачцэ Таццяне было ўсяго чатыры месяцы. (Таццяна, дарэчы, пасля выйдзе замуж за кампазітара Генрыха Вагнера.)

І вось 1921 год, Лідзія Ржэцкая вярнулася на радзіму і да канца жыцця звязала свой лёс з Першым беларускім дзяржаўным тэатрам, будучым Купалаўскім.

Гады. Я даволі часта і — трэба сказаць — з поспехам чытала са сцэны вершы Андрэя Александровіча. У розных гарадах і вёсках, на заводах і ў вайсковых часцях, дзе выступалі канцэртныя брыгады нашага тэатра (Першага БДТ, цяпер імя Янкі Купалы)... На некаторых канцэртах прысутнічаў аўтар... Мы разам з ім выходзілі на паклон. Невысокага росту, хударлявы, нібы хлапчук, ён сарамліва і неяк смешна кланяўся. Мне вельмі прыемна было чуць ад Андрэя Іванавіча словы ўдзячнасці і задавальнення ад таго, як я чытаю яго творы... Успамінаю такі надзвычай важны момант у жыцці нашага тэатра, калі вырашалася пытанне пра стварэнне лепшых умоў для яго творчага росту. Гаворка ішла аб пастаяннай стацыянарнай базе, аб ліквідацыі вандроўнага жыцця «на колах». Група нашых вядучых акцёраў, і я разам з імі, вырашылі ісці ў Наркамат асветы і паставіць пытанне пра ліквідацыю



Усялякае было... Але нязменнай заставалася любоў гледачоў. Ржэцкая нават у другарадных ролях умела запомніцца, нешта важнае распавесці... У тэатры яна сустрэла і свайго будучага мужа, Леаніда Рахленку, акцёра і рэжысёра. У БДАМЛМ у іх адзін агульны фонд...

Актрыса апынаецца ў бурлівым асяродку беларускай творчай інтэлігенцыі: артысты, мастакі, пісьменнікі, паэты, музыкі з энтузіязмам ствараюць нацыянальную культуру ў маладой рэспубліцы... У архіве захоўваецца выразка з артыкулам самой Лідзіі Ржэцкай — гэта напісаныя ёю па просьбе сына вядомага паэта Андрэя Александровіча ўспаміны пра яго бацьку. З сястрой Андрэя Александровіча Алесяй Ржэцкая іграла на адной сцэне — і ў «Беларускай хатцы», і ў БДТ-1. *«...даўно гэта было. Дваццатыя і трыццатыя цяжкіх умоў вандроўнага жыцця. На дапамогу мы запрасілі Андрэя Іванавіча Александровіча. І трэба сказаць, што яго актыўны ўдзел у гутарках спрыяў поспеху справы. Было прынята рашэнне, што сталіца рэспублікі Мінск з'яўляецца пастаяннай базай Першага беларускага дзяржаўнага тэатра, які цяпер носіць імя Янкі Купалы».*

У куце выразкі — надпіс рукою Лідзіі Ржэцкай: «Мае ўражанні пра Александровіча. Ён і Крыловіч блаславілі мяне на пост худрука». (Не ведаю, што дакладна маецца на ўвазе, бо мастацкім кіраўніком тэатра доўгі час быў Леанід Рахленка, а не Ржэцкая, магчыма, яна мае на ўвазе пасаду мастацкага кіраўніка студыі пры тэатры.)

А потым — вайна... Эвакуацыя... Франтавыя брыгады... У сваіх успамінах да 50-годдзя тэатра Ржэцкая піша: *«У гады Вялікай Айчыннай вайны тэатр знаходзіўся ў Томску. Мы разбіваліся на брыгады і адпраўляліся на фронт, выступалі перад параненымі ў шпіталях, ездзілі па Нарымскім краі. І паўсюль нас прымалі як дарагіх гасцей».*

ПОПЕЛ БУХЕНВАЛЬДА

У архіве захоўваецца нататнік, у якім Лідзія Ржэцкая запісвала свае ўражанні ад паездкі ў 1958 г. у ГДР у складзе дэлегацыі прафсаюза работнікаў культуры. Запісы прыгожым, упэўненым почыркам, вельмі падрабязныя. Прайшло толькі пятнаццаць гадоў пасля Вялікай Перамогі, успаміны пра вайну яшчэ вельмі свежыя і балючыя. Дэлегатам паказалі зруйнаваны Рэйхстаг, Брандэнбургскія вароты, якія толькі аднаўляліся. *«Побывали на братской могиле наших бойцов и командиров, где похоронено 7000 человек... Тысячи народу посещают этот памятник — это огромное поле, где покоятся наши люди. Свежие цветы и венки все время, кто бывает, приносят».*

Былі, зразумела, шматлікія творчыя сустрэчы, тэатральныя спектаклі. Лідзія Ржэцкая пазнаёмілася з жонкай Бертальда Брэхта Аленай Вейгель, дырэктарам тэатра «Берлінер ансамбль». Праўда, Ржэцкая заўважае, што спектаклі «сугубо формалистические, особенно оформление», параўноўвае ўбачанае з тэатрам Меерхольда.

Найбольшае ўражанне на актрысу зрабіла наведванне Бухенвальда.

«Осмотрели этот страшный памятник фашистской Германии. Все сохранилось в подлиннике, и там в одном из помещений организован музей. Бухенвальд посещает в среднем 400 000 ч. в год. Там погибло и уничтожено 80 000 ч., представителей 16 наций. Все сохранилось, печи, орудия пыток, все, все. Три года тому назад обнаружено еще две братские могилы в этом районе. Одна, где зарыто 16 000 чел., и одна 1500 ч., на том месте на дороге строится грандиозный памятник, который будет открыт в сентябре этого года. Можно себе представить, какая будет высота памятника, если нам заявили, что он будет виден из ближайших городов, расположенных от Веймара на расстоянии 25—30 км... В Бухенвальде сохранились все орудия пытки, столбы, тачки, куда запрягали по 16 ч. евреев, грузили страшной тяжестью, они перевозили, и их в это время заставляли петь — называли их «веселые лошади». Сохранились ящики женских волос, детской обуви. Там же погиб и был сожжен Эрнст Тельман... Там лежит мраморная доска с надписью и всегда живые цветы и венки... В Бухенвальде сохранены в документах и фамилии тех, кто действовал там в тот период, и, к сожалению, кто живет и пользуется сейчас всеми благами жизни в Западной Германии. Больше всего, конечно, погибло советских пленных солдат и офицеров. Для офицеров был отдельный барак. Их приводили голыми в особое помещение под видом медосмотра, проверяли рот, если во рту были золотые зубы, на груди делали крест, затем ставили как бы измерять рост под особую мерку, и через маленькое отверстие стреляли в затылок. Нам обо всем этом рассказывал свидетель всего того, что происходило в Бухенвальде, теперь он руководитель этого страшного музея — т. Кухарчик, чех, который был как пленный, и сохранился только потому, что работал водопроводчиком...»

У аўтаркі запісаў нават почырк на гэтых старонках мяняецца, робіцца больш нервовым, няроўным, размашыстым, калі яна апісвае пабачанае ў тым страшным месцы.

УВАСОБІЦЬ МАТЧЫНЫ РУКІ

Ёй вельмі ўдаваліся ролі, якія называюцца «ўзроставымі» — ад Альжбэты з «Паўлінкі» да прыслугі Варвары ў фільме «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Задумацца толькі: колішняя гімназістка, вытанчаная, адчайная, якая не пабаялася кінуць сям'ю і пайсці на сцэну, — дасканала ўвасабляе вобразы простых вясковых спрацаваных жанчын... Скульптар Заір Азгур пісаў пра майстэрства пераўвасаблення актрысы: *«у персанажах Л. Ржэцкай я нават бачу іх рукі. На спектаклях «Пяюць жаваранкі» або «Выбачайце, калі ласка!» адчуваў, што яны ў яе гераінь такія, якіх апявае М. Танк: «Іх цалавала зямля сваімі пясчанымі вуснамі і каласамі; неба спякотай, вятрамі, дажджамі іх цалавала... Толькі заўсёды, як мы зберымося дамоў // І на стол пакладзе рукі маці, // Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце // І ў сэрцы». Запэўніць гледача, што ён бачыць такія матчыны рукі, — творчы подзвіг!»*

Сёлета адзначаецца 125 гадоў з дня нараджэння народнай артысткі. Калегі называлі яе «сумленнем тэатра», «мамай Лідай», казалі, што яна была і строгай, і добрай... Крытыкі сцвярджалі, што ў яе ігры «ёсць нешта няўлоўнае, нешта няспыннавечнае, якое нельга акрэсліць словамі, але можна імгненна адразу ўспрыняць і зразумець. Гэтая здольнасць і ёсць талент».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Кіно

«На векі вечныя»

Аб чым будзе першы беларуска-кітайскі фільм

Дагавор аб сумеснай вытворчасці фільма 22 жніўня падпісалі Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і кампанія Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media (КНР).

Рабочая назва фільма — «На векі вечныя». Па сюжэце хлопец з Беларусі і дзяўчына з Кітая воляю выпадку адпраўляюцца ў адно і тое ж падарожжа. Там паступова яны разблытваюць забытую гісторыю гібелі беларускага лётчыка ў 1939 годзе ў Кітаі.

Па словах **акцёра і прадзюсара Лэй ХАНЯ,** у фільме будуць пераплятацца гістарычная і сучасная часткі.

— Гістарычная частка ахоплівае той перыяд, калі падчас Другой сусветнай вайны савецкія добраахвотнікі дапамагалі кітайцам змагацца з японскімі агрэсарамі. Асноўная мэта гістарычнай часткі — паказаць, што супрацоўніцтва Беларусі і Кітая склалася ўжо даўно. Сёння мы таксама настроены на мірнае ўзаемадзеянне. Асноўная мэта сучаснай часткі сюжэта — паказаць знешнюю прыгажосць Кітая і Беларусі, а таксама ўнутраную духоўную прыгажосць, — расцлумачыў ён.

Прадзюсар падзяліўся інфармацыяй, што 30 % кінастужкі зойміць гістарычныя дзеянні, 30 % — сучасны час у Беларусі, і яшчэ 40 % — сучаснасць у Кітаі.

У сваю чаргу **Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ** заявіў, што гэта пагадненне ўмацуе сяброўства дзвюх дзяржаў, а сам праект дапаможа больш глыбока пазнаёміцца з кітайскай і беларускай культурамі.

— Магчыма, гэта першы крок да такога маштабнага супрацоўніцтва, але ўжо цвёрды і ўпэўнены. Я думаю, у будучыні мы разгледзім магчымасць стварэння сумеснай анімацыі, а нашы маладыя аніматары змогуць атрымаць неацэнны вопыт, — адзначыў ён.

Па словах Юрыя Аляксея, графіку для фільма будуць ствараць у Кітаі.

— У іх больш прасунутыя тэхналогіі, якія нам цікавыя. Я хацеў бы, каб нашы тэхнікі, аператары і мантажоры паехалі ў Кітай і атрымалі досвед работы з сур'ёзнымі тэхналогіямі. Вялікую стаўку мы робім на маладых хлопцаў з Акадэміі мастацтваў, паколькі для іх гэта будзе жывы прыклад, і яны шмат чаму навучацца, — падзяліўся ён.

Да таго ж Юрый Мар'янавіч дадаў, што ў нашых народаў вельмі шмат агульнага.

— Я быў з візітам у Кітаі. Гэта вельмі блізкія нам па духу людзі. Самае галоўнае — яны добрапрыстойныя, сумленныя, і нам вельмі прыемна з імі працаваць. Вы ведаеце, я ганаруся тым, што ў нас атрымалася на нашым фестывалі «Лістапад» у мінулым годзе выйсці на такія сяброўскія адносіны, якія перайшлі ўжо ў стадыю рэалізацыі. Гэта вельмі важна і для краіны, і ў цэлым для нашага народа.

Кастынг для ўдзелу ў міжнародным праекце пройдзе 24—26 жніўня ў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Так, на галоўную мужчынскую ролю будуць падбіраць прафесійнага акцёра ва ўзросце 20—30 гадоў, таксама будуць шукаць і другарадных герояў. Напрыклад, маладую актрысу славянскай знешнасці і хлопчыкаў розных узроставых катэгорый.

Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.

Нясумнае чытанне

«Жанчыны тут сышліся талакою дапамагчы нашаткаваць капусты»

Што літаратурныя героі назапашвалі на зіму

Лета зіму корміць — недарэмна кажуць у народзе. Беларусы — людзі гаспадарлівыя, звыклі рабіць прыпасы. А як жа без іх? Таму ў кнізе Ганны Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня», што вучыла кабет XIX стагоддзя весці гаспадарку, гэтаму прысвечаны цэлы раздзел — «Як захаваць на зіму свежую капусту ў качанах», «Як захоўваць у сотах свежы мёд цэлы год», «Як захаваць зімой зялёны гарох», «Як захаваць агрэст для страў на зіму», «Як захоўваць зімой свежыя слівы-венгеркі»... Нават у наш час, калі ўсё можна не толькі набыць у краме, але і замовіць па інтэрнэце на дом, хочацца самому назапасіць сакавіты плён лета ў халадзільніку ці каморы. А як рабілі прыпасы нашы літаратурныя героі і што менавіта яны назапашвалі — давайце ўспомнім разам.

Грыбы

Якуб Колас дужа любіў збіраць грыбы. Цэлыя кошыкі баравікоў дадому прыносіў. Таму ў хаце заўсёды меліся назапашаныя грыбочкі. І ў паэме «Новая зямля» пра гэта гаворыцца:

«Мне не даюць грыбы спакою,
Баравікі мне часта сняцца,
Мне з імі трэба паквітацца...
Чорнагаловыя, ўдалыя,
Баравічкі мае любыя!
Якою слаўнаю сям'ёю
Вы ўстаяце перада мною!
Я помню летнія часіны
І вас, грыбныя баравіны!
Ранюткі час. Нідзе нікога,
Між дрэў звіваецца дарога,
А па дарозе ты з кашом
У лес шыбуеш ціхачом,
Каб ашукаць жанок руплівых,
Бяссонных, вечна клапатлівых,
І ім на злосць, на зайздрасць тую
Набраць грыбоў капу, другую,
Пакуль агледзяцца яны,
Што там «карэньчыкі адны».

Салёныя агуркі

Сярод літаратурных герояў чэмпіёнка па прыпасах, вядома, Вольга Ляновіч, гераіня рамана Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт». Увішная надзвычай гандлярка з Камароўкі... Чаго толькі няма ў яе: ад мукі да пісталета. І ў метадах не саромеецца. Штось вырошчвае сама, а штось і прыўлашчвае. Калі пачалася вайна, пажывілася ў разбітых крамах. А што, вайна — вайною, а жыць трэба! Але каханне да выкупленага палоннага, мройнага ідэалістычнага юнака Алеся, мяняе Вольгу... Паўплывала і сутыкненне з нямецкімі акупантамі, калі тыя заявіліся ў дом дзеля рабунку. Дабраліся нават да пограба, куды пагналі Алеся...

«Калі зверху асвятлілі ліхтарыкам, здзівіўся прасторы падзямелля і колькасці дубовых бочак — іх стаяла штук восем, шматвядзёрных, смачна пахла квашанай капустай, кропам, дубовым лісцем, але пахла і склепам, прэласцю і яшчэ нечым едкім, як аміяк, ад чаго слязіліся вочы.

Маўклівы гітлеравец, што спусціўся следам, загадаў яму нахіліць бочку. Ды Алесь не здужаў зрушыць яе з месца. Немец зняважліва паглядзеў, як ён натужваецца, і гэтак жа зняважліва груба адпіхнуў хлопца, так што той балюча выцяўся галавой аб бетонную сцяну пограба. Лёгка, адной рукой, немец перакуліў бочку з гуркамі, расол абліў Алесю ногі, гуркі рассыпаліся па бетоннай падлозе, захрусталі пад ботамі ў фашыста, ён давіў іх знарок, з асалодай».

Зёлкі

Цёплай парою самы час назапасіць лекавыя зёлкі. У Янкі Купалы ёсць кранальны верш «Бабулька — прадаўшчыца зёлак», на які паэта натхніла падгледжанае ў жыцці:

«У Менску на рынку,
Ў канцы агароды,
Бабулька старая
Садзіцца заўсёды.
Усякія зёлкі
На рынак прыносіць
І людцаў прахожых
Купляць у ёй просіць.
Ляжаць перад бабкай,
Ці вечар, ці ранак,
Пучкі дзівасілу,
Чабор і румянак.
Ад кожнай хваробы
Ё зёлкі, карэнне;
Лячыць можа імі
Падвей, парушэнне.
І любчыку нават
Дасць вам пад сакрэтам
Ды наўча, як зводзіць
Любізнічкам гэтым.
І ўсякіх, усякіх
Дастанеце лекаў,
Якіх толькі людзі
Не зналі ад векаў...
І кепска бабульцы:
Сівая, худая,
Брак сіл працаваці,
Дык зёлкі збірае.
Нясе іх да Менска,
На рынку садзіцца,
Збывае і вуча,
Як трэба лячыцца.
А можа, паможа
Душы хоць адной дзе,
І праца бабулькі
На марна не пойдзе».

Дарэчы, на гэты верш напісаў песню Уладзімір Мулявін.

Сена

Галоўны герой аповесці Алеся Жука «Паляванне на апошняга жураўля» Сцяпан, ветэран вайны, перажывае, што сучасныя людзі адвучыліся працаваць на зямлі. Напрыклад, назапашваць на зіму сена. Ужо і Сцяпану не трэба гэтага рабіць, але як адвыкнуць?

«Сцяпан устаў рана. З тою спрадвечнаю трывогаю сенакоснае пары, якую ён памятае з малых год. Трэба скасіць, высушыць, састагаваць сена. Пакуль пагода на дварэ. У памяці гэтая пара жыла пахам дзёгцю, якім тлуста падмазвалі колы, ранняю гаманою на вуліцы — і жанок, і дзяцей...

Сцяпан не прыкмячаў сам, што цяпер паўтараў той, дзесяткамі гадоў нажыты лад жыцця. Так ён пачынаў рабочы дзень тады, калі і зямлю аралі конькі, і з кожнае хаты амаль што было па мужчыну, не кажучы ўжо пра хлапчукоў і хлопцаў, калі касілі і звозілі сена ў гумны, калі жалі і вазілі снапы, і на жніво звінела поле ад песень, калі яму падносілі сноп, калі яму жанкі звівалі вянок!..

Цяпер у гумне складаюць сена, канюшыну. Сцяпан не заходзіў у гумно — пастаяў у варотах — вось і ўся яго гатоўка да касьбы: адчыніць гумно, каб скідаць сена, скласці цюкі, калі будзе сцюкаванае. Косамі касіць не трэба, грэбці самім не трэба — чакай, пакуль прывязуць».

Квашаная капуста

Уладзімір Караткевіч у вершы «На пачатку дарог» апаэтызаваў працэс нарыхтоўкі капусты. У вёсцы яе назапашвалі талакой, ставілі бочкамі:

«Жанчыны сечкамі
таўкуць бадзёра,
Як быццам спора выбіваюць такт
Для нейкай небывала
хуткай полькі.
Ў распараныя глоткі
цёмных бочак
Плыве капуста белаю гарой.
Яе засыплюць соллю
з чорным кмінам
І зоркамі
чырвонай смачнай морквы,
Там-сям антонаўку
для духу кінуць
І зноўку пачынаюць
дружна стукаць...
Газніца цьмяна
свеціць на шынкоўні:
Жанчыны тут сышліся «талакою»
Дапамагчы
нашаткаваць капусты,
А каб сказаць па праўдзе,
паспяваць,
Пажартаваць,
забыўшы ноч і цемру...»

Бульба

Для герояў аповесці Васіля Быкава «Знак бяды», старых вяскоўцаў Петрака і Сцепаніды, галоўны запас — гэта бульбачка. Дарэчы, слова «бульба» і вытворныя ад яго паўтараюцца ў гэтай невялікай аповесці дзевяноста чатыры разы!

Пятрок разважае: *«Бульба добра ўрадзіла сёлета, на гародзе яе ўжо выкапалі і засыпалі поўную яму, але і яшчэ будзе не меней. У яму ж каторы год пад вясну находзіць вада, таму рэшту трэба закрыць у капец на пагорку ў канцы гарода — так заўсёды рабілі на хутары ва ўраджайныя на бульбу гады. Бульбачку трэба было шанаваць, тая здаўна была галоўным набыткам з поля — хлеб радзіў не заўсёды і к вясне канчаўся, а бульбачкі часцяком хапала да новай. Калі яе ў час выбраць, засцерагчы ад марозу, вады, дык хапала сабе і скаціне — бульбачка не адзін ужо год бараніла ад голаду».*

Праўда, дарабляць капец з бульбай даводзіцца жонцы Петрака Сцепанідзе: *«Не дужа складаная гэта справа, хоць і лічылася чыста мужчынскай, — забуртаваць якія два вазы бульбы. Сцепаніда падраўняла кучу, падгрэбла, шчыльней абклала саломай і пачала абкопваць зямлёй».*

Яблыкі

А вось Пімен Панчанка ў вершы «Яблыкі», напісаным у 1975 годзе, падымае важную праблему — як не даць згінуць багатаму ўраджаю садавіны, як палескай антонаўцы трапіць да сталічнага спажыўца?

«Урадзіла сёлета не скупа
Белых, бурштыновых, залатых.
І плыве ўначы пад зорны купал
Смачны пах садоў, як мёд густы.

Як жа гэтым яблыням цудоўным
Да сталіцы рукі дацягнуць?
Яблыкі галлё у дугі гнуць,
Іх — куды ні глянь —
усюды поўна.

Хрубастацъ іх будуць не мінчане,
Над ападам горбіцца наш сад.
Тут кароў салодкае мычанне,
Яблычнае свята ў парасят.

Самазвалы
на прасёлках грузнуць.
Восень.
На зямлі і ў небе муць.
А па Чорным моры сухагрузы
Яблыкі заморскія вязуць.

